Новы час
30 жніўня 2019 | № 32 (643) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №8

Літаратурная Беларусь

Выпуск №8 (156)
(жнівень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»
lit-bel.org
novychas.by

Змест

Адлік ад Каліноўскага



Віктар САЗОНАЎ

Нядаўна ў Свіслачы (Гродзенская вобласць) Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь разам з адмысловымі спецыялістамі з Беларусі і Літвы правялі археалагічныя працы па эксгумацыі парэштkаў Віктара Каліноўскага, роднага брата легендарнага кіраўніка паўстання 1863–64-ых гадоў Кастуся Каліноўскага. Навошта?



Афіцыйная версія гэтых работ палягае на тым, што літоўскі бок хоча параўнаць мяркуемыя парэшткі Кастуся Каліноўскага, знойдзеныя ў Вільні, з таксама мяркуемымі парэшткамі яго брата.

Неафіцыйная версія таксама агучваецца ў народзе, «вітае» ў вуснай і пісьмовай форме, і яна менш аптымістычная. Паводле яе, хочуць, маўляў, нам абвесціць, што і там, і там, ці хоць як мінімум у Беларусі, ДНК Каліноўскага не выяўлена...

У другой версіі не так шмат смешнага, як здаецца на першы погляд. Сённяшнія беларускія ўлады не адзін год пераследуюць тых актывістаў, якія прыязджаюць у Свіслач ушанаваць памяць паўстанцаў. Каму-каму, а ім, уладам, яўна непатрэбна, каб ДНК Каліноўскага знайшлося ў Беларускай зямлі. Ім было б лепш, каб і імя яго не гучала ў беларускім паветры. Чыё заўгодна хай гучыць! Пра расейскіх Сцяпана Разіна ці Емяльяна Пугачова нават у школе можна распавядаць, а вось Каліноўскі — нешта іншае... Да яго асаблівыя адносіны ў сённяшніх кіраўнікоў Беларусі... І рэч не ў асабістых сімпатыях ці антыпатыях нашых чыноўнікаў да тых ці іншых гістарычных постацяў. Справа ў адносінах гэтых гістарычных постацяў да ўлады ўвогуле...

«Не народ для ўлады, а ўлада для народа», — абвесціў ён, яшчэ і не адзін раз паўтарыў. І гэтымі словамі засведчыў, што аніякай дыктатуры не хоча, не толькі чужынскай, але і сваёй, родненькай. Ды і сам у дыктатары не імкнуўся

«Бравы казак» Сцяпан Разін заяўляў, што не збіраецца скідаць з трона расейскага цара Аляксея Міхайлавіча. Ён па старой расейскай звычцы ва ўсім вінаваціў баяраў, ваяводаў, іншую адміністрацыю, якую цар расейскі і прызначаў. Супраць жа царскай тыраніі, як увогуле супраць дыктатуры, прэтэнзій нібыта і не выстаўляў. Прынамсі, на словах.

Другі адважны казак Емяльян Пугачоў пайшоў яшчэ далей у гэтым пытанні. Ён абвясціў сябе спадкаемцам трону расейскага імператара Пятром Трэцім і яшчэ па адной расейскай звычцы хацеў кепскага цара замяніць на добрага. У дадзеным выпадку на сябе самога. Зноў жа, прынамсі, на словах. І зноў жа: да існавання дыктатуры як да адзіна мажлівай сістэмы кіравання аніякіх прэтэнзій не меў.

Ну і якія ў такім разе да гэтых геpаічных расейскіх «хлопцаў» могуць быць прэтэнзіі ў сённяшняй беларускай улады (як і ў расейскай)? Героі — і ўсё тут. Можна і ў школе іх ставіць у прыклад. А вось беларускі паўстанец Кастусь Каліноўскі — справа іншая!

«Толькі тады, народзе, зажывеш шчасліва, калі над табой маскаля ўжо не будзе», — заявіў ён у вечнасць. (Маскалямі тады называлі чыноўнікаў, пастаўленых ад імя Расейскай імперыі кіраваць народам, або расейскіх салдат. Не трэба слова «маскаль» блытаць з словам «рускі». Гэта не адно і тое. Але зараз не пра гэта развагі, а пра тое, што не хацеў Кастусь расейскай дыктатуры над беларускім народам. — В. С.). «Не народ для ўлады, а ўлада для народа», — абвесціў ён, яшчэ і не адзін раз паўтарыў. І гэтымі словамі засведчыў, што аніякай дыктатуры не хоча, не толькі чужынскай, але і сваёй, родненькай. Ды і сам у дыктатары не імкнуўся. Вось і ўся розніца!

Ну то за што яго будзе шанаваць сённяшняя ўлада?! А пасля яго геpаічнай смерці, якая завяршыла не менш геpаічнае, хоць і кароткае жыццё, знайшліся спадкаемцы яго ідэй і яго змагання. Па сённяшні дзень захаваліся такія. Таксама дыктатуры не любяць. Вось і хапаюць іх, калі ў Свіслач прыязджаюць на магілу Віктара Каліноўскага... Ну то ці зацікаўленыя ўлады ў тым, каб Слава гэтага месца ў свет пайшла?! Так што падазрэнні ў праўдзівасці экспертызы не на пустым месцы вырастаюць. Тым больш, што працы праходзілі без належнай галоснасці.

Ну а пра тое, хто ўклаў грошы ў той мемарыял і ці дазваляе ён яго бурыць — ні ў каго з прадстаўнікоў улады і ў галаву не прыйшло пацікавіцца. Мажліва, яны такія грошы за грошы не лічаць. Але ж тыя, хто «скідваўся» апошнімі сродкамі, маюць на гэты конт іншае меркаванне...

Зрэшты, што скажуць па завяршэнні работ адпаведныя службы і адказныя асобы, не так ужо і важна. Важна, што сказаў сам Кастусь Каліноўскі. А ён ужо ўсё сказаў. Ад яго ідзе той адлік, які будучыню Беларусі дапускае толькі як незалежную, свабодную, і абавязкова дэмакратычную. Гэты адлік ідзе і абавязкова прыйдзе да лагічнага завяршэння.

racyja.com

(Працяг развагаў пра постаць Кастуся Каліноўскага, яго аднадумцаў і само паўстанне 1863 года — на старонках 11(5), 12(6) і 13(7) у аповедах з будучай кнігі Уладзіміра АРЛОВА і Паўла ТАТАРНІКАВА «Айчына: маляўнічая гісторыя» («Змагарны 1863-ці»).


Амаль праз месяц у нашай краіне пачнецца чарговы перапіс насельніцтва. Сярод пытанняў (нумар 12 і 13), на якія трэба будзе адказаць падчас перапісу, будзе і пытанне пра Вашую родную мову.

Адказ мае не толькі сімвалічнае, але і практычнае значэнне. Ад колькасці грамадзян, якія ў анкетах пазначаць беларускую мову, будзе залежаць далейшая палітыка дзяржавы і яе будучае існаванне. Адказам «беларуская» мы станоўча паўплываем на яе лёс!



Горкае пітва жаноцкасці

У чэрвені ў выдавецтве «Медысонт» пабачыў свет паэтычны зборнік Таццяны Зіненка «Гарчэйшае пітво», укладзены Леанідам Галубовічам, які ўжо традыцыйна апякуецца спадчынай нашых паэтаў, чый лёс быў складаны альбо нават трагічны і чыя спадчына заставалася невядомай і неўладкаванай.



Гэта другая пасмяротная кніга паэткі. Першую («Плакала дзяўчынка», «Ковчег», 2013) выдалі яе сябры і калегі з Барысава. Зямны шлях Таццяны абарваўся ў 2011 годзе, калі ёй споўнілся 51 год. А калісьці былі — заканчэнне філфака БДУ, праца настаўніцай беларускай мовы, актыўны ўдзел у адраджэнскім жыцці і літаратурных суполках падчас перабудовы савецкага грамадства. Тады Т. Зіненка шмат пісала і друкавалася, але з сярэдзіны дзевяностых яе самабытны голас гучаў усё радзей, а потым і зусім змоўк у хмельным забыцці і адстароненасці.

Гаючая сіла паэзіі такая, што, перагарнуўшы апошнюю старонку гэтай пранізлівай споведзі, дзякуеш за сустрэчу з паэтычным голасам такой незвычайнай моцы і чысціні.

Адкрываецца зборнік грамадзянскай лірыкай канца васьмідзясятых: заклікі да незалежнасці краіны, неспакой за лёс Беларусі, роднай мовы. Усё раніць чулую душу: чарнобыльскі жах («О Беларусь! Мая туга. / Чарнобыльская парадзіха, радыяцыйная смуга!»), нявызначанасць лёсу народа, надзея на лепшы вырак для любай «зеленавокай матулі» (так называе паэтка Беларусь). Тэма роднага краю праходзіць праз усю творчасць Т. Зіненка: ад амаль казачнага («Буслы мой род на свеце збераглі») да горкага:

Узыдзеш і глядзіш —
навошта нарадзіўся?
І на сваёй зямлі ж —
а быццам памыліўся.

У вершы «Я — крывічанка» паэтка ўрачыста і пранізліва апявае свой народ, высокі дух якога ніхто не мог адолець і запляміць, «бо мы трымаліся за памяць, за розум і за карані». У гэтым ды іншых падобных вершах Т. Зіненка нагадвае свайго духоўнага брата — Анатоля Сыса, якому ахвяравала асобны высокапатрыятычны верш-прызнанне. Але большасць вершаў прысвечаныя іншай тэме — каханню. Тут паэтка выяўляе такую ж самасць і тэмперамент, аднак гэтыя якасці абарочваюцца для яе лірычнай герaіні (думаю, цалкам правамоцна атаясамліваць яе з самой паэткай) асабістым пеклам. Зрэшты, пекла ўзнікла пазней, а спачатку вершы поўняцца наіўнай маладой верай у жаночае шчасце. Як у маляванках Алены Кіш, з радкоў тых вершаў паўстае «жаданне трапіць у рай, вечнае й немагчымае». Але не можа быць раю для жанчыны, якая намагаецца паказаць мужчыне сваю прагу творчасці і прагу кахання — прычым па ўласных правілах. Таццяна і сама гэта разумее, але насуперак разуменню верыць у магчымасць быць каханай жанчынай і творцай адначасова. Марная надзея. З году ў год у вершах нарастаюць матывы адчаю і безнадзейнай тугі:

Мы больш, чым кахаем.
Мы — камень аб камень з табою,
гара да гары
і бяссонныя ўздыхі начэй.
І мне абдымацца
лягчэй з несхадзімай зарою.
О, мой велягур!
І табе не са мною лягчэй.

Здзіўляцца тут няма чаму. У любую эпоху жыццё жанчыны, якая выходзіла за межы стандартнай жаночай долі і магла сказаць пра сябе словамі Т. Зіненка: «любіла я ў сабе паэта», рэдка складвалася ўдала. Караліна фон Гюндэродэ, Эн Сэкстан, Сільвія Плат… За жанчынай ахвотна прызнавалі ролю прыгажуні-музы, але калі ўжо яна сама «забаўляецца вершамі», дык вершы гэтыя мусяць быць бяскрыўдным упрыгажэннем салоннага альбома. Мужчынскі позірк заўсёды паблажліва слізгае па радках, напісаных жанчынай, з большай увагай на тое, як дама выглядае. Але калі ўсё ж мог разглядзець у іх талент, а ў жанчыне — асобу, якая нічым яму не саступае, тут жа ўзнікалі страхі ды падазрэнні. Калі яна пасмела займець свой голас, то ці так ужо патрэбен ёй мужчына? Можа, больш бяспечна знайсці сяброўку? Або няхай кіне пісаць, бо мужчыны робяць гэта нашмат лепш! Усе гэтыя разборкі з уласнай ідэнтычнасцю, дэпрэсіі ды эмацыянальныя зрывы, якія ведае кожны сапраўдны творца, — навошта яны жанчыне, раптам у гэты час ежа на пліце падгарыць? Любоў да паэзіі — забароненая любоў! — як і любая забароненая жарсць у гэтым свеце, ахвотна даравалася мужчынам і не даравалася жанчынам.

Настойваючы на жаданні тварыць, жанчына, па сутнасці, асуджае сябе на выгнанне з грамадства абывацеляў, дзе вобраз «памочніцы мужчыны» зацэментаваны ў канструктах утульнай і клапатлівай альбо — версія нумар два — прыгожай і лёгкадумнай. Жыццё «нармальнай» жанчыны несумяшчальна ні з творчай смеласцю, ні з творчым адчаем. Т. Зіненка калі й не разумела гэтага да канца, дык адчувала: каханне не прынясе ёй шчасця. Яна пайшла наперакор свайму ўладкаванаму жыццю, — насустрач пакліканню. Але не кахаць не магла:

А я без дазволу, а я без прынукі
за Вамі наўслед, як ніхто, палячу.
Без Вас не знайду я ні гора, ні мукі —
а я толькі гора і мукі хачу.

У першых двух радках — праўда жанчыны. У двух апошніх — праўда паэткі. І вось тут зерне яшчэ адной трагедыі (ці не зашмат для ўразлівай душы?). Калі губляецца розніца паміж літаратурай і жыццём (узгадаем Яўгенію Янішчыц: «Любоў мая, ты песня і маркота»), на свае пачуцці пачынаеш глядзець як на матэрыял для творчасці, на сваё жыццё — як на эксперымент. Зразумела, што пачуцці патрэбны моцныя і неардынарныя (нярэдка негатыўныя). Гэта разбурае чалавека, але надае энергію паэзіі. І зусім не выпадкова вершы Янішчыц і Зіненка так часта перагукаюцца:

«Я й перад смерцю вымаўлю: люблю» (Я. Янішчыц);
«Я па табе заплачу і ў труне» (Т. Зіненка);
«А жыць — пакуль баліць / На сэрцы вышыня» (Я. Янішчыц);
«Я адчуваю, што жыву высока» (Т. Зіненка).

Ды і хіба можа быць інакш, калі «маё аблічча — толькі форма, / Адлітая для струн душы» (Я. Янішчыц).

Навошта было так аддавацца пачуццям — да «апошняга палёту» над безданню? А паспрабуй супрацьстаяць трагічнаму іх напалу, калі ты — жанчына, якой спрадвеку сусветнай культурай навязваецца рамантызаваны вобраз кахання. Як доўга можна выкарыстоўваць свой душэўны боль для паэтычных эксперыментаў? Напружанне занадта высокае, і ў рэшце рэшт пачынаеш шукаць спосаб выключыць свядомасць, каб не балела.

…У рамане «Палявыя доследы ўкраінскага сэксу» Аксана Забужка напісала пра рамантычнае каханне: «У жыцці трагедыя выглядае непрыгожа». Дададзім: не тое, што ў ружовым чытве для дам, дзе сентыментальныя гераіні любілі, пакутавалі і заставаліся пры тым — абавязаны былі заставацца! — прыгожымі ды спакуслівымі. Таццяна Зіненка ў сваёй сапраўднай і непрыдуманай трагедыі прыгожай не была. А яе вершы — былі. І ёсць. Выкупленыя цаной жыцця, яны зоймуць сваё высокае месца ў беларускай паэзіі.

Алена Брава

Вандроўнік па сцяжынах памяці



Паэтычны голас Усевалада Гарачкі з ранейшага гучна-эпатажнага і ёрніцка-сцёбнага па меры жыццёвага і творчага сталення пачаў рабіцца больш спакойным, ціхім, разважлівым і пранікнёна-кранальным.

Гэтую адмысловую паэтычную трансфармацыю пераканаўча засведчыў яго новы паэтычны зборнік «Каляровыя слёзы», выдадзены да 50-гадовага юбілею аўтара. У кнігу, апублікаваную ў канцы 2018 года выдавецтвам «Галіяфы», увайшлі вершы рознай тэматычнай і настраёвай скіраванасці.

Бадай, галоўным матывам кнігі з'яўляецца памяць, якая выступае ў якасці своеасаблівага мастка ў любыя яго сэрцу і душы часы бесклапотнага дзяцінства і вірлівай маладосці. Таму, відаць, нездарма зборнік і адкрываецца вершам «Дзяцінства», якое ўспрымаецца як час, калі «жалуды і каштаны / былі даражэй, / чым золата і каменне». Вялікая роля памяці ў светаўспрыманні аўтара хораша выяўлена ў наступнай паэтычнай мініяцюры:

Гэта не сонца садзіцца:
на захадзе
даўняе замчышча
свеціцца —
жар разварушаны,
памяць.

Уражвае тонкая пачуццёвасць большасці вершаў зборніка, што зусім не характэрна сучасным пераважна стрыманым і «халодным» паэтам у нашым сённяшнім прагматычна-цынічным свеце. Хаця ў кнізе змешчаны і творы сатырычнага зместу (найперш звязаныя з асаблівасцямі святкавання суайчыннікамі гадавінаў апошняй вайны), але ж не яны складаюць дамінанту «Каляровых слёз», а менавіта вершы спавядальныя, пранікнёна-інтымныя. Інакш кажучы, аўтар паўстае перад чытачом у першую чаргу «ціхім лірыкам», схільным да гранічнай шчырасці і нават да пэўнай сентыментальнасці, у межах якой творца непрыхавана апавядае прае свае эмоцыі і пачуцці, вострыя перажыванні і душэўныя пакуты, не саромеючыся пры гэтым нават уласных… слёз.

Змест многіх вершаў пераконвае, што ў пошуках свайго (не)дасяжнага шчасця паэту давялося ў жыцці многае зведаць, прайсці праз шматлікія выпрабаванні і пакуты, каб урэшце адчуць сябе свабодным і стаць своеасаблівым уладаром уласнага міні-сусвету:

Зжаўцее,
а потым абрынецца лісце,
і нешта абрынецца ў нас:
чагосьці чакалі,
цярпелі,
а зараз — свабода.
Мы выйдзем на вуліцы дзеяць
сваю рэчаіснасць...

Заўважную ролю ў паэтычным мысленні У. Гарачкі адыгрываюць таксама яго сны, фантазіі і мроі, якія робяць аўтарскі свет больш прываблівым і шматкаляровым і без якіх рэчаіснасць выглядала б шэрай і прэснай. Прычым гэтыя сны найчасцей не светлыя і дабратворныя, а найчасцей трывожныя і нават па-кафкіянску страшныя, у нечым падобныя да фільмаў жахаў.

У кнізе нярэдка сустракаюцца арыгінальныя, самабытныя аўтарскія метафары і эпітэты, якія, безумоўна, лашчаць слых, радуюць вока і душу: «пабачым ранкам твой улоў: / На нітках рытмаў нізкі слоў»; слёзы «змыюць малюнкі мінулага». Аднак дзеля справядлівасці варта сказаць, што ў зборніку там-сям можна сустрэць і няўцямныя, нацягнута-штучныя, а то і папросту недарэчныя, безгустоўныя вобразы і параўнанні, якія псуюць уражанне ад некаторых вершаў. Да ліку такіх, відавочна, няўдалых словазлучэнняў і вершаваных радкоў можна аднесці, на маю думку, тыя, дзе аўтар сузірае выпадковасць думкі, «нібы варону, / што ўзнялася па-над светам»; дзе бабы «такія ж дурныя, як кулі»; дзе шчасце аказваецца «чорнай прамавугольнай каробкай»…


Акрамя таго, у кнізе, на жаль, сустракаюцца і пэўныя запазычанні вобразаў, метафар з вершаў знакамітых замежных і айчынных паэтаў. Так, вобраз ператварэння цела чалавека ў гліну, які ў адным з вершаў выкарыстоўвае Усевалад Гарачка, з'яўляецца традыцыйным для класічнай персідскай паэзіі (найчасцей гэтая метафара сустракаецца ў Амара Хаяма); вобраз «цягніка жыцця» здаецца наўпрост запазычаным з верша «Поезд жизни» Марыны Цвятаевай (да таго ж, існуе яшчэ і выдатны замежны мастацкі фільм з такой жа назвай); параўнанне душы з ветразем адразу нагадвае радок «душа — как парус, душа — как арфа» з верша Ігара Северяніна пад назвай «Поэза раскрытых глаз» (1915)…

Наогул, аўтар вершаванага зборніка «Каляровыя слёзы» адначасова ўяўляецца мне як нястомны вандроўнік па шматлікіх сцяжынах сваёй памяці, і як самотны блукальнік па цёмных лабірынтах сваіх сноў, мрояў і фантазій. І на гэтых бясконцых шляхах ёсць практычна ўсё — як сказаў бы замежны класік — «и жизнь, и слёзы, и любовь». Дык хай жа гэтыя «каляровыя слёзы» ўзнікаюць на тварах аўтара толькі ад радасці і шчасця, а на тварах чытачоў кнігі — ад захаплення пранікнёным паэтычным словам Усевалада Гарачкі і шчырай удзячнасці яму за яркія запамінальныя вобразы!

Эдуард Дубянецкі

Праца — не воўк,

Або як вядомыя пісьменнікі стваралі літаратурныя шэдэўры



Фота www.miridei.com

Джэйн Осцін (1775–1817) — аўтарка раманаў «Гонар і прадузятасць», «Пачуццё і адчувальнасць», «Эма», «Довады розуму». Джэйн Осцін жыла з маці, сястрой, сяброўкай і трыма слугамі. У яе ніколі не было магчымасці адасобіцца. Джэйн даводзілася працаваць у сямейнай гасцінай, дзе ёй у любы момант маглі перашкодзіць. Пісала яна на маленькіх кавалках паперы, і як толькі чулася рыпенне дзвярэй (папярэджванне аб наведвальніку), яна паспявала схаваць нататкі. Пазней сястра Джэйн Касандра ўзяла на сябе клопат пра вядзенне гаспадаркі. Удзячная Джэйн пісала: «Не ўяўляю, як можна пісаць, калі ў галаве круцяцца катлеты з бараніны»...

Жорж Санд (1804–1876) звычайна пісала па 20 старонак за ноч. Праца па начах стала звычкай з дзяцінства, калі яна даглядала хворую бабулю і толькі ноччу магла займацца любімай справай. Пазней яна пакідала заснулага палюбоўніка ў ложку і пасярод ночы сядала за пісьмовы стол. А назаўтра не заўсёды памятала, што пісала ў сонным стане. Хоць Жорж Санд была незвычайным чалавекам (насіла мужчынскую вопратку, заводзіла раманы і з жанчынамі, і з мужчынамі), яна асуджала злоўжыванне кавай, алкаголем або опіумам. Каб не заснуць, ела шакалад, піла малако або курыла. «Калі надыходзіць момант надаць сваім думкам форму, — казала яна, — трэба цалкам валодаць сабой, што на падмостках сцэны, што ў сваім кабінеце».

Гюстаў Флабэр (1821–1880) пісаў «Мадам Бавары» пяць гадоў. Праца ішла занадта павольна і пакутліва: «“Бавары” не ідзе. За тыдзень — дзве старонкі! Ёсць з чаго набіць сабе пысу ад роспачы». Прачынаўся Флабэр у дзесяць раніцы, не ўстаючы з ложка, чытаў лісты, газеты, паліў трубку, гутарыў з маці. Затым прымаў ванну, снедаў і абедаў адначасова і адпраўляўся на шпацыр. Адну гадзіну ён выкладаў пляменніцы гісторыю і геаграфію, потым сядаў у крэсла і чытаў да сямі вечара. Пасля багатай вячэры некалькі гадзін гутарыў з маці і, нарэшце, з надыходам ночы пачынаў пісаць. «У рэшце рэшт, — прызнаваўся ён, — праца — найлепшы спосаб выслізнуць ад жыцця».

Леў Талстой (1828–1910) уставаў позна, ні з кім не размаўляў, пакуль не памыецца, не пераапранецца і не прычэша бараду. Снедаў (кава і пара яек) і зачыняўся да абеда ў кабінеце. Зрэдку там сядзела яго жонка Соф'я — на выпадак, калі прыйдзецца перапісаць ад рукі пару раздзелаў «Вайны і міру» або выслухаць чарговую частку сачынення. Перад абедам Л. Талстой выпраўляўся на шпацыр. Калі вяртаўся ў добрым настроі, мог дзяліцца ўражаннямі або займацца з дзецьмі. Калі не — чытаў кнігі, раскладваў пасьянс і гутарыў з гасцямі.

Марк Твэн (1835–1910) пісаў «Прыгоды Тома Соера» на ферме, дзе яму пабудавалі асобную альтанку-кабінет. Працаваў пры адчыненых вокнах, прыціснуўшы лісты паперы цаглінамі. Нікому не дазвалялася наблізіцца да кабінета, а калі М. Твэн быў вельмі патрэбны, хатнія трубілі ў горан. Па вечарах М. Твэн чытаў сям'і напісанае. Ён беспярапынна курыў цыгары, і дзе б ні з'явіўся, пасля яго даводзілася праветрываць памяшканне. Падчас працы яго мучыла бессань, і, па ўспамінах сяброў, ён пачаў лячыць яе шампанскім на ноч. Шампанскае не дапамагло — і М. Твэн папрасіў сяброў назапасіцца півам. Потым М. Твэн заявіў, што яму дапамагае толькі шатландскае віскі. Пасля серыі эксперыментаў Марк Твэн лёг на сваю пасцель у дзесяць вечара і нечакана заснуў. Усё гэта вельмі забаўляла яго. Зрэшты, яго забаўлялі любыя жыццёвыя падзеі.

Марсэль Пруст (1871–1922) пісаў раман «У пошуках страчанага часу» амаль 14 гадоў. За гэты час ён напісаў паўтара мільёна слоў. Каб цалкам засяродзіцца на працы, М. Пруст схаваўся ад грамадства і амаль не выходзіў з сваёй знакамітай абітай дубам спальні. Працаваў М. Пруст па начах, днём спаў да трох ці чатырох гадзін. Адразу пасля абуджэння запальваў парашок, які змяшчаў опіум, — так ён лячыў астму. Амаль нічога не еў, толькі снедаў (кава з малаком і круасанам). Пісаў М. Пруст у ложку, уладкаваўшы сшытак на каленях і падклаўшы падушкі пад галаву. Каб не заснуць, прымаў кафеін у таблетках, а калі прыходзіў час спаць, заядаў кафеін вераналам. Мучыў ён сябе наўмысна, лічачы, што фізічны боль дазваляе дасягнуць вышынь у мастацтве.

Самэрсэт Моэм (1874–1965) за 92 гады жыцця апублікаваў 78 кніг. Біёграф С. Моэма называў яго працу не пакліканнем, а залежнасцю. С. Моэм і сам параўноўваў звычку пісаць са звычкай піць. Абедзве лёгка набыць і ад абедзвюх складана пазбавіцца. Першыя дзве фразы С. Моэм прыдумляў, лежачы ў ванне. Пасля пісаў дзённую норму ў паўтары тысячы слоў. «Калі пішаш, калі ствараеш персанаж, то ён увесь час з табой, ты заняты ім, ён жыве». Спыняючыся пісаць, С. Моэм адчуваў сябе бясконца адзінокім.

Джэймс Джойс (1882–1941) пра сябе пісаў: «Чалавек нядобры, схільны да экстравагантнасці і алкагалізму». Ні рэжыму, ні арганізацыі не меў. Спаў да дзесяці, снедаў у ложку (кава і булачкі), зарабляў урокамі англійскай ды ігрой на піяніна, пастаянна займаў грошы і «адцягваў» крэдытораў размовамі пра палітыку. Каб напісаць «Уліса», яму спатрэбілася сем гадоў з перапынкамі на восем хвароб і васямнаццаць пераездаў у Швейцарыю, Італію, Францыю. За гэтыя гады ён правёў за працай прыкладна 20 тысяч гадзін.

Нават калі напярэдадні ён дапазна піў, падымаўся не пазней шасці раніцы, адчуваў сябе бадзёра. Працаваў Хэмінгуэй да апоўдня, стоячы каля паліцы. На паліцы стаяла друкарская машынка

Агата Крысці (1890–1976), ужо выдаўшы дзясятак кніг, у анкетным радку «род заняткаў» пазначала: «хатняя гаспадыня». Яна працавала ўрыўкамі, не маючы ні асобнага кабінета, ні нават пісьмовага стала. Пісала ў спальні за умывальным столікам або магла «прымасціцца» за абедзенным сталом у перапынках паміж прыёмамі ежы. «Мне бывала трохі няёмка “ісці пісаць”, — казала яна. — Але калі ўдавалася адасобіцца, зачыніць за сабой дзверы і зрабіць так, каб ніхто не перашкаджаў, то я забывала пра ўсё на свеце».

Фрэнсіс Скот Фіцджэральд (1896–1940) свой першы раман «Па той бок» пісаў у трэніровачным лагеры на кавалках паперы ў вольны ад службы час. Адслужыўшы, забыўся пра дысцыпліну і стаў ужываць алкаголь як крыніцу натхнення. Да абеду спаў, часам працаваў, ноччу гуляў у барах. Калі здараліся прыступы актыўнасці, мог за адзін падыход напісаць 8000 слоў. Гэтага хапала для вялікага апавядання, але было недастаткова для аповесці. Калі Фіцджэральд пісаў «Ноч пяшчотная», яму з вялікай цяжкасцю ўдавалася быць цвярозым тры-чатыры гадзіны. «Тонкае ўспрыманне і меркаванне падчас рэдагавання несумяшчальныя з выпіўкай», — пісаў Фіцджэральд, прызнаючыся выдаўцу, што алкаголь перашкаджае творчасці.

Эрнэст Хэмінгуэй (1899–1961) усё жыццё прачынаўся на світанні. Нават калі напярэдадні ён дапазна піў, падымаўся не пазней шасці раніцы, адчуваў сябе бадзёра. Працаваў Хэмінгуэй да апоўдня, стоячы каля паліцы. На паліцы стаяла друкарская машынка, на машынцы ляжала драўляная дошка, засланая аркушамі для друку. Калі спісваў алоўкам усе старонкі, ён здымаў дошку і перадрукоўваў тэкст. Кожны дзень ён падлічваў колькасць напісаных слоў і рабіў графік. «Калі заканчваеш, — прызнаваўся пісьменнік, — адчуваеш сябе спустошаным, але не пустым, а зноў запаўняешся, нібы займаўся каханнем з каханым чалавекам».

Уладзімір Набокаў (1899–1977) «накідваў» тэксты раманаў на невялікіх картках, якія складваў у доўгую скрынку для каталогаў. Ён запісваў кавалкі тэксту на картках, а потым складваў з фрагментаў старонкі і часткі кнігі. Такім чынам рукапіс і працоўны стол змяшчаліся ў скрынцы. «Лаліту» У. Набокаў пісаў па начах на заднім сядзенні аўтамабіля, мяркуючы, што там няма шуму. Пастарэўшы, У. Набокаў ніколі не працаваў пасля абеду, глядзеў футбольныя матчы, дазваляў сабе келіх віна і паляваў на матылькоў, здаралася, прабягаючы за рэдкім экзэмплярам да 25 кіламетраў.

Жорж Сіменон (1903–1989) лічыцца самым пладавітым пісьменнікам XX-га стагоддзя. На яго рахунку 425 кніг: 200 бульварных раманаў пад псеўданімамі і 220 пад сваім імем. Прычым рэжым Ж. Сіменон не выконваў, працаваў прыступамі па дзва-тры тыдні, з шасці да дзевяці раніцы, выдаючы па 80 друкаваных старонак. Затым гуляў, піў каву, спаў і глядзеў тэлевізар. Пішучы раман, ён да заканчэння працы насіў адну і тую ж вопратку, падтрымліваў сябе транквілізатарамі і ніколі не правіў напісанае.

Жан-Поль Сартр (1905–1980) працаваў тры гадзіны раніцай і тры гадзіны ўвечары. Астатні час займала свецкае жыццё, абеды і вячэры, выпіўка з сябрамі і сяброўкамі, тытунь і наркотыкі. Гэты рэжым давёў філосафа да нервовага знясілення. Замест таго, каб адпачыць, Сартр «падсеў» на карыдран, сумесь амфетаміну і аспірыну, легальны да 1971 года. Замест звычайнай дазоўкі па таблетцы двойчы ў дзень Сартр прымаў дваццаць штук. Першую запіваў моцнай кавай, астатнія павольна жаваў падчас працы. Адна таблетка — адна старонка «Крытыкі дыялектычнага розуму». Паводле сведчанняў біёграфа, у штодзённае меню Сартра ўваходзілі два пачкі цыгарэт, некалькі трубак чорнага тытуню, больш літра алкаголю, уключаючы гарэлку і віскі, 200 міліграмаў амфетаміну, барбітураты, чай, кава і тлустая ежа.

Харукі Муракамі (нарадзіўся ў 1949 г.) устае ў чатыры раніцы і піша шэсць гадзін запар. Пасля працы бегае, плавае, чытае, слухае музыку. У дзевяць вечара — «адбой». Х. Муракамі мяркуе, што паўтаральны рэжым дапамагае яму пагрузіцца ў транс, карысны для творчасці. Калісьці ён вёў сядзячы лад жыцця, набіраў вагу і курыў па тры пачкі цыгарэт у дзень. Потым пераехаў у вёску, стаў харчавацца рыбай і гароднінай, паліць кінуў і больш за 25 гадоў займаецца бегам. Адзіны недахоп — адсутнасць зносін. Каб выконваць рэжым, Х. Муракамі адмаўляецца ад усіх запрашэнняў, і сябры крыўдзяцца. «Чытачам усё роўна, які ў мяне рэжым дня, — адзначыў ён, — абы чарговая кніга стала лепш папярэдняй».

Паводле telegraf.com.ua

У палоне далоняў



Таццяна НЯДБАЙ

* * *

Вось бывае так —
знаёмішся з нейкім хлопцам,
Балбатня нязмушаная,
лёгка і весела так,
Скайп-кантактамі абмяняліся,
выбралі опцыю
«Пасябраваць» на фэйсбуку,
колькі смайлікаў у лістах.

Далей — перадышка на працы
й супольная кава ў онлайне
З парай паказак і цытат —
копі-пэйст, гіперлінк, інтэрнэт,
Нічога прыватнага і асабістага.
А віртуальны лайнер
Вас пасля вяртае — кожнага
да сваіх планет.

Магчыма, вы нават пашчыруеце
неяк увечары —
Яму заўтра да бацькі ехаць у вёску,
перакапаць агарод.
І сярод гэтых размоваў ты ўявіш сябе
з ім у вечнасці,
Уявіш вочы дзяцей і ўнукаў,
якія працягнуць ваш род.

І ловіш сябе на думцы —
мамы ў яго ўжо няма, акей, хаця
Ёсць агарод — трэба будзе
палоць памідоры,
Дом пад Мінскам — гэта, вядома,
з плюсаў, але вырашаеш: працяг
Немагчымы, бо іншыя ў цябе планы —
жыць ля мора.

А з ім — проста добра перакінуцца
цёплымі словамі,
Пазычыць салодкіх сноў і пачуць,
што ты прыгожая.
Бо вы разам з ім да паловы начы,
нібы да жыцця паловы,
Заседзеліся, дык кожны
расчуліцца можа.

А ён жа — зусім не той, ты кажаш сабе,
зусім не такі —
Порткі з трыма палоскамі,
памідоры з дзядоўнікам, трункі
Такія, што ты не п'еш. Ты б не ўзяла.
А возьмеш — кінь.
Але — бялізну пайшла і выбрала ў краме —
з карункамі.

Пасля зазірнеш да яго ў фэйсбук,
а там нейкая краля — Лера.
Не сястра нібы, не пляменніца, і —
па фотцы — нічога ў ёй асаблівага.
А ён ужо з паўгадзіны онлайн
і табе не піша нічога, халера,
А ты ўжо з паўгадзіны глядзіш
на статус, і думаеш — блін!

Ну і ладна! Няхай яна й мые
яму посуд, гатуе абеды,
Пад дзядоўнікам памідоры гадуе,
глядзіць старога,
І ты зараз яму сама напішаш,
каб ён проста ведаў,
Што ты ўсё адно не пусціла б яго
далей парога,
Што цябе дастала гэтая бытавуха,
што ён злыдзень,
Паматросіў і кінуў, а ты дзеля яго —
эпіляцыю воскам.
І што з таго, што ты з ім знаёмая
ўсяго тыдзень —
З хлопцам, які носіць порткі
з трыма палоскамі.

* * *

прачынацца і
выкарчоўваць сэрца

свайго бліжняга
ненавідзець лішняга
як костачкі з вішняў
вымаць пальцамі

дзёрзкімі словамі
цягучымі смоламі
ляжаць голымі
выпадковымі пастаяльцамі

не джэкпотаў прага
не букмекерская смага
ні жар-птушкі, ні магаў
ні цудаў хачу чароўных-навароржаных

ад жыцця — жыцця
гаючага пачуцця
а нібы няўцям
як яшчэ бывае як можам мы

прачынацца ў палоне
мяккіх далоняў
пахкіх півоняў
водары яблыкаў з уласнага саду

як ядвабных пялёсткаў
пацалункаў порсткіх
і каб дажджы касыя хлёсткія
асеннія а мы ў цеплыню ложка
пáдаем
каб свяціў маяк
каб было як
расціснуць кулак
і расказваць сны
прачнуўшыся на світанні

каб штарміла мора
й адганяла ворагаў
а не нас у мораку
смугой ледзяной вітала

* * *

так пахла ліпамі з усіх гарадскіх двароў,
масты, як коткі, свае выгіналі спіны,
прымружвалі вочы салодка пад ліхтароў
паглядамі дзіўнымі,

і мы кахаліся на даху, як галубы,
ды мы ўсміхаліся пілотам аэрапланаў,
бясстрашным вікінгам ты ўвайшоў сюды,
каханы,

і столькі радасці прыносіў твой кожны рух,
хавала ад шчасця слёзы ў тваіх далонях,
і ў смаках вуснаў, цела, рук
і ўлоння,

і мы засыналі адным на дваіх сном,
на адной хвалі ўлюбёнай FM
з джэм-сэйшнамі,
так пахне астрамі цяпер за маім вакном,
а табой ад мяне пахне па-ранейшаму

* * *

Цёмныя бяссонныя вулкі
Дзе золата становіцца меддзю
Бадзяюся ў пошуку прытулку
Пакуль ты да мяне не едзеш
Патанаю кусаючы вусны
У сполахах успамінаў цела
Дзе табе да валасоў русых
Прытуліцца шчакой карцела

Замок без ключа



Алесь ЗАМКОЎСКІ

* * *

я збіраю ранішні дождж
у вушныя ракавіны
у дрыготкі кубак далоняў
у зрэнкі і бельмы
на валасах кроплі робяцца салодкімі
на вуснах салёнымі
горкімі на языку
– дзе ты? — я на небе.
на нямытым шкле
пальцам без імені
выкрэсліваю непатрэбныя літары
першую за другой
другую за трэцяй
ніводная літара не патрэбна
– дзе ты? — я між аблокамі.
дождж патанае ў пяску
дождж перапаўзае ад сэрца да сэрца
дождж яднае камяні
дасылае цёплыя лісты
па адрасе да запатрабавання
– дзе ты? — я ў сезоне дажджоў.
усё набрыняла
усе зліліся
усе нарадзіліся
усё расце

* * *

зямля выціскае на свет камяні.
адзін. другі. трэці.
вяртае нам косткі, успаміны, подыхі.
усё, ад чаго мы жадаем пазбавіцца,
усё, да чаго нас цягне мацней.
зямля спакушае далучыцца да згубленага.
крычыць уночы і плача ўдзень.
і штохвіліну стогне.
зямля вырашае,
калі нам (прый/сы)сці,
і ставіць пячатку альфы-амегі
ў самым нязручным месцы.
зямля выкідае на мокры
заходнедзвінскі бераг замок.
памаранчавы.
іржавы.
без ключа.
дакранацца да яго не мае сэнсу:
не ажыве.

* * *

што змянялася з таго часу,
як ты стаў
дарослым?
у занядбаным двары састарэлага дома
тыя ж бруднатварыя калюжыны.
дзікунскія песні ссохлых катоў
грукочуць у нямытыя
нават перад Вялікаднем
шыбы.
рыпяць іржавыя ад людзей арэлі.
як жа бязлітасна знаёма
рыпяць арэлі!
у пад'ездзе не паменшала
сабачых слядоў,
суседскай крыві і вантробаў,
жоўтых безнадзейных лямпачак.
у бацькоўскай кватэры
гэтак жа
жывуць
бацькі.
я далёка з форткі выцягваю шыю.
пазіраю ўніз.
там выраслі дрэвы.
вялізнымі лапамі ахінулі
мінулае дзяцінства,
сённяшнюю сталасць.
змрок запанаваў у двары.
цемра перамяшалася
з пяшчотай.
лесвіца выпрабоўвае прыступкамі
зламаная
трэснутая
зледзянелая
лесвіца тужыць па моцных нагах
тонкая
слізкая
мяккая
лесвіца марыць пра ўзнёсласць
пагарэлая
вільготная
заквітнелая
лесвіца імкнецца да неба
мы жывём у адвечным страху любові
ні вуснамі ні далонямі
не дакранаемся да прыступак
толькі крочым у адваротны бок
ад неба
тры
два
адзін

* * *

знешні свет мулка нагадвае пра сябе
наўмысна
смяцяр таўчэ ломам і голасам
лёд
містар лёс
выцягвае з глыбокай кішэні
пакоцаны лот
мой лот
павольна выцягвае з асалодай
галінкі таполі падаюць адна на адну
мне кажуць
глядзі атрымалася купальскае вогнішча
ды не ды не
тут спаляць дзяцей чумы і халеры
пахрышчаных блаславлёных
і мяне з імі разам
і з маіх літар складуць ружанцы
латарэя не дазваляе ўваскрэснуць шанцу
Госпадзе
змілуйся
змілуйся
Госпадзе

* * *

расціснуты па перыметры прасторы
выходзіш на вуліцу
і адразу
у той жа замацаваны лёсам момант
атрымліваеш бамперам гожай тачкі
па левай нырцы
кіроўца
увесь у выбачэннях кідаецца да цябе
адрынутага
і робіцца моташна праз тое
як ён п'яны і з бруднымі рукамі
невыносна настойліва імкнецца заціснуць
у твой страўнік пабітыя вантробы
а разам з імі ўвесь духоўны свет
ці то свой а можа выпадковага мінака
дзякуеш кіроўцу даеш яму на піва
а сам
а сам узрадаваны чарговым
бессэнсоўным выпадкам шчасця
скіроўваешся ў традыцыйную чарачную
каб аддаць гарачы летні дзень
паганскаму жаданаму бахусу
і выпаўзці з-пад стойкі толькі ўвечары
калі няма ні спёкі
ні надакучлівых натоўпаў
выключна кавалак старога асфальту
дзе яшчэ чарнеюць плямы тваёй крыві

* * *

задаволенае ў часе цела
ляжыць у чаканні снегу
сэрца выкацілася з грудзей
ляжыць недалёка
стварае нацюрморт
на крывой ручцы рытмічна
сціскаюцца пальцы
раз-раз два-два восем-восем
мацнее жаданне паклікаць
холад голад і немач
але не магчыма бо няма чым
няма галавы
галаву пазычыў вецер
валачэ яе па праспекце
невядомай перамогі
калі надакучыць кіне ў завулку
міргаць пачырванелымі вачыма
а цела ў снежні ўзнімаецца само
бясследна пойдзе
у адваротны бок

Змагарны 1863-ці

Уладзімір АРЛОЎ

Нацыянальна-вызвольнае паўстанне Кастуся Каліноўскага — адна з самых важных падзеяў беларускай гісторыі. Расейскія гісторыкі, а таксама ўсе, хто не хоча бачыць нашу краіну незалежнай, заўсёды называюць паўстанне 1863 года «польскім». Але ж многія гісторыкі Польшчы ўжо даўно зрабілі выснову, што Каліноўскі не быў палякам, а збройнае змаганне на нашых землях было не польскім, а беларускім, бо ў ім бралі ўдзел паўстанцы-беларусы, якімі камандавалі таксама беларусы. Ваяры Тадэвуша Касцюшкі і змагары 1831 года імкнуліся аднавіць Вялікае Княства Літоўскае і Рэч Паспалітую. Каліноўскі і ягоныя аднадумцы змагаліся ўжо за самастойную Беларусь. Адным з іхніх пароляў былі знойдзеныя ў архіўных дакументах словы «Каго любіш? — Люблю Беларусь! — Так узаемна!». Няпраўда і тое, што супроць расейскіх каланізатараў выступілі адны каталікі. У шэрагах паўстанцаў было шмат праваслаўных беларусаў. У паўстанні ўдзельнічалі беларускія паэты Францішак Багушэвіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Арцём Вярыга-Дарэўскі, Фелікс Тапчэўскі. Паўстанне Каліноўскага сталася першым крокам да будучай незалежнасці Беларусі.

Да зброі!

Паўстанне добра падрыхтавала арганізацыя адданых сваёй справе патрыётаў на чале з Каліноўскім. У кожным павеце яны мелі надзейных людзей, прызначаных вайсковымі і грамадзянскімі начальнікамі. Былі падабраныя асобы, якія сталі баявым ядром паўстанцкіх аддзелаў. Камандзірамі абіралі тых, хто меў добры вайсковы досвед, найперш былых афіцэраў. Былі створаныя запасы зброі і боепрыпасаў. Змагары ўмела захоўвалі таямніцы. Самі ж расейскія ўлады прызналі потым: яны і не падазравалі, што край выбухне магутным паўстаннем.

Збройная барацьба на беларускім абшары разгарнулася ўжо ў канцы студзеня 1863 года. Паўстанцы атакавалі царскі гарнізон у мястэчку Сураж пад Беластокам. Рота расейскіх войскаў адступіла, не здолеўшы абараніць свой арсенал. Нашы ваяры захапілі шмат зброі, спынілі рух на чыгунцы і перарэзалі тэлеграфную лінію. Расейскі тэлеграфіст яшчэ паспеў адправіць панічную тэлеграму, што ў Сураж увайшла тысяча «мяцежнікаў».

Вялікія паўстанцкія сілы на некалькі сотняў шабляў, стрэльбаў і сялянскіх косаў, якія таксама ператвараліся ў грозную зброю, сабраліся ў мястэчку Сямяцічы Бельскага павета. Інструктары навучалі добраахвотнікаў вайсковай справе. Ішла нарыхтоўка харчу і зброі. Напалоханыя царскія ўлады кінулі на патрыётаў паўтары тысячы пяхотнікаў, казацкі эскадрон і артылерыйскую батарэю. Першы штурм ворагаў паўстанцы адбілі, але мусілі з баямі адступіць. Помсцячы жыхарам Сямяцічаў за падтрымку змагароў, карнікі спалілі большую частку мястэчка.

У лютым каліноўцы занялі мястэчка Шарашова, а затым — Пружаны, дзе вызвалілі з турмы зняволеных паплечнікаў. Сакавік-красавік стаў часам хуткага стварэння паўстанцкіх аддзелаў ва ўсіх губернях. Часовы ўрад Літвы-Беларусі паставіў заданне, каб у кожным павеце за зброю ўзяліся 100–150 змагароў. У паўстанцкія шэрагі ўступалі шляхта, чыноўнікі, студэнты і навучэнцы, патрыятычна настроеныя афіцэры расейскага войска. Пятую частку змагароў складалі сяляне, што адгукнуліся на заклік Каліноўскага, надрукаваны ў «Мужыцкай праўдзе». Яны сталі касінерамі — ваярамі, узброенымі вертыкальна насаджанымі на касільны косамі. Бясстрашныя касінеры наводзілі на ворагаў жах і дапамагалі паплечнікам здабыць перамогу.

На Лідчыне паспяхова ваявалі з расейскімі карнікамі змагары Людвіка Нарбута. Чатыры сотні паўстанцаў налічваў аддзел вайсковага начальніка Гарадзенскага ваяводства Валера Урублеўскага. Ён не раз даваў годны адпор царскім войскам, хоць нашы ваяры на пачатку мелі ўсяго 230 паляўнічых стрэльбаў і сто косаў, а сёй-той наогул быў узброены дубінай. Пад камандаю Зыгмунта Сераконскага на Ковеншчыне ваявала цэлае двухтысячнае злучэнне. З баямі дайшоў з Берасцейшчыны да Слуцкага павета аддзел Рамана Рагінскага. Пад Барысавам паўстанцы ўзялі ў палон расейскага генерала.

У Кобрынскім павеце геаічна адбівалі наступы расейцаў падначаленыя Рамуальда Траўгута. Начальнік Магілёўскага ваяводства Людвік Звяждоўскі ў траўні заняў на ўсходзе Беларусі горад Горы-Горкі. Змагароў падтрымалі студэнты тамтэйшага земляробчага інстытута і павятовай вучэльні. «Ліцьвінскай кавалерыяй» на Гарадзеншчыне камандаваў Казімір Кабылінскі. Ён далучыўся да паўстання разам з трыма сынамі і ўдзельнічаў да сваёй геаічнай гібелі ў дваццаці баях.

Самаадданa кіравалі паўстанцкім рухам Цітус Далеўскі, Генрык Дмахоўскі, Антон Трусаў, Тамаш Грыневіч, Фелікс Віславух, Юльян Бакшанскі, Лявон Плятэр, Баляслаў Святарэцкі, Ігнат Будзіловіч, Атон Грабніцкі, Вінцэнт Козел-Паклеўскі, Баляслаў Калышка, Францішак Юндзіл і дзясяткі іхніх баявых пабрацімаў.

Баі і сутычкі з расейскімі войскамі адбываліся на ўсім абшары краю.

Рэйкавая вайна

Надзвычай цікавая старонка паўстання — рэйкавая вайна. У гады Другой сусветнай вайны такую вайну вялі супроць нямецкіх акупантаў беларускія партызаны. Не менш гераічна дзейнічалі на нешматлікіх тады яшчэ, праўда, чыгунках нашыя змагары ў 1863-м.

На самым пачатку збройнай барацьбы ў руках паўстанцаў апынулася частка чыгуначнага шляху, што вёў з Варшавы да Беластока. На станцыю Лапы прыйшоў цэлы цягнік з падмогаю нашым ваярам. Праз некалькі студзеньскіх дзён яшчэ адзін паўстанцкі аддзел таксама на Беласточчыне заняў станцыю Чыжэва. Інжынер-чыгуначнік, які перайшоў на бок паўстанцаў, перадаў камандзіру каштоўныя звесткі пра рух цягнікоў і разабраў станцыйны тэлеграфны апарат. У выніку рух паміж Варшавай і Пецярбургам быў спынены на цэлы тыдзень.

У першыя дні сакавіка каліноўцы адважна напалі на чыгуначны вакзал у Горадні і захапілі ў царскага начальства 10 тысяч рублёў, неабходных на набыццё зброі. Пасля перастрэлкі частка нашых ваяроў здолела пакінуць горад на паравозе. На станцыі Парэчча пад Горадняй да паўстанцаў далучыліся пятнаццаць чыгуначных службоўцаў і рабочых.

Калі расейскія ўлады пачалі перакідваць чыгункаю карныя войскі, паўстанцы абстрэльвалі і спынялі цягнікі на лясных перагонах, псавалі лакаматывы, палілі масты. Яны ссякалі тэлеграфныя слупы, разбіралі рэйкі.

У красавіку па ўсім краі разнеслася вестка пра тое, як каліноўцы пусцілі пад адхон царскі цягнік паблізу Чыжэва. Пра назву гэтай беларускай станцыі хутка даведаліся чытачы французскіх газет, дзе з’явіліся малюнкі паспяховай атакі на непрыяцельскі цягнік. Еўрапейская прэса наогул шмат пісала пра паўстанне, змяшчаючы ілюстрацыі пра баявыя дзеянні змагароў.

Царскія ўлады мусілі скараціць перавозкі, а начны рух пасажырскіх цягнікоў паміж Варшавай і Вільняй наогул быў адменены. Буйныя станцыі ахоўвалі цэлыя палкі салдатаў. Улетку выйшаў загад: дзеля абароны чыгункі высякаць пабапал яе лясы па 150 сажняў (320 метраў) з кожнага боку, а вакол станцый — па 300 сажняў на ўсе бакі. Усе цягнікі ахоўваў канвой не меней за роту салдат.

Каліноўцы не давалі спакою каланізатарам на чыгунках да самай восені 1863 года.

Банольдзі, Сокалаў, Базанаў

Там, дзе змагаюцца за волю, пад сцягі барацьбітоў заўсёды становяцца і людзі іншых нацыянальнасцяў. Так было і ў векапомным 1863-м. Поплеч з нашымі прадзедамі ў Літве-Беларусі ваявалі палякі, украінцы, расейцы, латышы, патрыёты з заходнееўрапейскіх краінаў.

У Літоўскі камітэт, што рыхтаваў паўстанне, уваходзіў выхаванец Лазанскага ўніверсітэта таленавіты спявак і танцмайстр італьянец Ахіл Банольдзі. Апынуўшыся воляю лёсу ў Вільні, ён хутка стаў ліцьвінам па духу, цудоўна спяваў беларускія народныя песні. Перад паўстаннем на перамовах у Польшчы Банольдзі адстойваў самастойнасць земляў Вялікага Княства Літоўскага і права яго народаў на будучае, незалежнае ад Варшавы дзяржаўнае жыццё. У заснаванай Ахілам фотамайстэрні рыхтаваліся патрэбныя каліноўцам дакументы. Найбольш вядомы нам фотапартрэт Кастуся Каліноўскага зроблены якраз Ахілам Банольдзі.

Італія была радзімаю продкаў іншага знакамітага паўстанца — мастака Міхала Андрыёлі. Ён ваяваў у аддзеле Людвіка Нарбута і ў сваіх малюнках пакінуў сапраўдны летапіс змагання. Андрыёлі добра вядомы сёння і сваімі таленавітымі ілюстрацыямі да паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш».

У паўстанні загінуў афіцэр расейскай арміі ўкраінец Андрэй Патабня. Ён быў выхаванцам Полацкага кадэцкага корпуса і пад уплывам сяброў — ліцьвінскіх патрыётаў — стаў перакананым ворагам цара і расейскіх каланізатараў.

Дваццаціґадовы юнак Апалон Сокалаў прыехаў вучыцца ў Горы-Горацкі земляробчы інстытут з глыбіні Расеі. Калі Горкі занялі паўстанцы Людвіка Звяждоўскага, Апалон быў сярод некалькіх дзясяткаў студэнтаў, якія далучыліся да змагароў. Ён заставаўся са сваім камандзірам да самага моманту вымушанага роспуску аддзела і пастановы па адным прабівацца з акружэння на захад.

Агентам Віленскага паўстанцкага камітэта стаў расеец Дзмітрый Базанаў. Ён займаў пасаду пісара ў Троцкім павеце. У паперах царскай следчай камісіі адзначалася, што Базанаў меў незвычайную дзёрзкасць і энергію і адпраўляў «бунтаўнікам» вялікія партыі зброі.

Сокалава, Базанава ды іхніх суайчыннікаў-расейцаў царскі суд караў — параўнаўча з даўнімі жыхарамі нашага краю — больш жорстка. Апалона пазбавілі дваранства і маёмасці ды асудзілі на дванаццаць гадоў катаржнай працы ў сібірскіх капальнях, дзе і згасла ягонае нядоўгае жыццё.

Захаваліся звесткі пра тое, што ў палон да расейскіх карнікаў трапіла некалькі параненых чарнаскурых паўстанцаў-мурынаў (неграў). Сярод змагароў былі таксама вольналюбныя сыны вугорскага народа. Нашы паўстанцы-катаржане пакінулі ва ўспамінах сведчанні, што разам з імі ў Сібіры мужна адбывалі цяжкае пакаранне іхнія таварышы па зброі — французы.

Кажуць, што Айчыну не выбіраюць. Але кожны можа выбраць свабоду.

Маці, жонкі, каханыя

«Якая маці, сястра, жонка, сяброўка, каханая, дачка не знойдзе шляху да сэрца мужчыны, што яе любіць? Натхніце ж іх! Запаліце агнём! Спыніце свае забавы і дарагія задавальненні. Айчына патрабуе помсты і малітваў, ахвяраванняў на зброю і на справу паўстання». Гэтыя словы гучалі ў паўстанцкай адозве «Ліцьвінкі і Русінкі!». Але і без гарачых заклікаў жанчыны дапамагалі, як маглі, каліноўцам.

Дакументы, складзеныя расейскімі следчымі, паведамляюць, што яшчэ перад паўстаннем многія жанчыны нашага краю насілі «рэвалюцыйныя знакі і адзенне» і спявалі забароненыя патрыятычныя песні ды гімны. Такія спевы шмат разоў гучалі ў Менскім катэдральным касцёле Дзевы Марыі, у храмах Навагрудка, Мазыра, Пінска, Рэчыцы, па ўсім абшары былога Вялікага Княства Літоўскага. Існавалі цэлыя вандроўныя групы жанчын-запявалаў, якія пасля набажэнстваў распачыналі сапраўдныя канцэрты з забароненых каланізатарамі песняў. Вядома, што за гэтае «злачынства» былі пакараныя спявачкі Вітольда Гувальт, Аліна Белавежская і дзясяткі яе аднадумніц з Гомельскага павета.

На знак салідарнасці з паўстанцамі і жалобы па палеглых змагарах шляхцянкі насілі вопратку, капелюшыкі і парасоны чорнага, белага і фіялетавага колераў. Раз’ятраныя расейскія ўлады забаранілі любыя жалобныя знакі і абкладалі непаслухмяных жанчын вялікімі штрафамі. Шляхцянку Амалію Лашкевіч абвінавацілі ў тым, што яна пашыла сабе нацыянальны ўбор і фіранкі непажаданых белага і чырвонага колераў. Марыю Ульянаўскую судзілі за «крамольныя» песні і за частаванне ў дзень свайго нараджэння сялян-уніятаў, якія адмаўляліся прымаць праваслаўную веру.

Царскім служкам не падабалася ўжо тое, што дзяўчаты і кабеты «асаблівым чынам падстрыгалі сабе валасы». У Кацярыны Шалюты адабралі ўсю маёмасць за распаўсюд антыўрадавых вершаў і ўлётак. Шляхцянка Ванда Белікович (родам з Віцебскай губерні) паклала ў труну мужу-паўстанцу сваё фота і была за гэта пакараная штрафам на 300 рублёў (столькі атрымліваў за год наглядчык у расейскай турме).

У час паўстання жанчыны-ліцьвінкі былі кур’еркамі, выведніцамі, захоўвалі зброю і порах, забяспечвалі нашых ваяроў харчам. За такую дзейнасць у турму кінулі Алімпіяду Каплінскую з Барысаўскага павета і Юлляну Алендскую з Сенненскага, а Ізабелу Цеханавецкую царскі суд у Магілёве пастанавіў выслаць у Варонежскую губерню. Адважнай сувязной стала ў 1863-м пляменніца мастака Напалеона Орды і сама таленавітая мастачка Алена Скірмунт. Царскі суд пастанавіў разлучыць яе з мужам і дзецьмі і выслаць у далёкі расейскі Тамбоў.

Працяг на стар. 12 (6) »

Змагарны 1863-ці

« Заканчэнне. Пачатак на стар. 11 (5)

Нашы мужныя жанчыны былі сёстрамі міласэрнасці ў паўстанцкіх шпіталях, давалі прытулак параненым каліноўцам. Яны наймаліся на працу ў царскія турмы, дзе разносілі ежу, мылі зняволеным паўстанцам бялізну, падтрымлівалі іхні дух размовамі. Нарачоная Каліноўскага Марыя Ямант з сёстрамі стварыла ў Вільні жаночы камітэт. Ён браў пад апеку паўстанцкія сем'і і саміх зняволеных змагароў, якім перадавалі лісты і прадукты. Такія камітэты існавалі і ў іншых губернскіх гарадах.

Будучая знакамітая пісьменніца Эліза Ажэшка хавала генерала Рамуальда Траўгута, якога пазней пад выглядам сваяка вынаходліва перапраўіла ў Варшаву.



Міхаіл Мураўёў у Літве. Пакаранне паўстанцаў на шыбеніцах

Каміла Марцінкевіч

Дачка беларускага пісьменніка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча — Каміла — яшчэ ў дзяцінстве здзіўляла ўсіх бліскучымі музычнымі здольнасцямі. Яна цудоўна спявала і грала на піяніна. З васьмі гадоў Каміла ўжо давала канцэрты ў Менску, Вільні, Кіеве, Варшаве. У праграме была музыка яе ўлюбёных кампазітараў Фрыдэрыка Шапэна і Ферэнца Ліста ды ўласныя творы. Дзяўчына мела і акторскі талент. Яна выходзіла на сцэну ў менскай пастаноўцы славутай оперы «Сялянка», музыку да якой напісаў Станіслаў Манюшка, а лібрэта (тэкст) — бацька Камілы.

Але сябры і аднадумцы ведалі і іншую Камілу. У яе дома праводзіла сходы менская арганізацыя Літоўскага камітэта, што займалася падрыхтоўкай паўстання. У 1861 годзе паліцыя высачыла патрыётку. За ўдзел у вулічных дэманстрацыях і навучанне менчукоў рэвалюцыйным гімнам Камілу зняволілі ў вар'ятню. «Хваробаю» палічылі любоў да Айчыны ды мары наблізіць яе вызваленне ад расейскага ярма. Жыхары горада шматлюдна пратэставалі каля сценаў ператворанай у турму лякарні. Зняволенай штодня прыносілі жывыя кветкі, для яе спявалі песні. Каб спыніць гэтыя пратэсты, царскія ўлады вымушаныя былі вызваліць «хворую».

На пачатку змагарнага 1863-га Камілу зноў арыштавалі. Падставай стаў данос расейскага салдата, да якога яна звярнулася з прапановаю прадаць зброю. Патрыётку трымалі ў турэмным Пішчалаўскім замку і ў былым кляштары бернардзінаў. Там Каміла Марцінкевіч атрымлівала лісты з прызнаннямі ў каханні ад аднаго з кіраўнікоў менскіх паўстанцаў Караля Станкевіча, які таксама трапіў за краты.

Каміла ўражвала катаў сваім непахісным духам. Калі паўстанца Яна Жмачынскага вялі на смяротнае пакаранне, дзяўчына з вакна сваёй камеры кінула яму пад ногі букет кветак. Царскія ўлады на 25 гадоў выслалі Камілу пад паліцэйскі нагляд у расейскі горад Салікамск. Яна змагла вярнуцца на радзіму толькі праз дваццаць гадоў, калі цяжка і невылечна захварэла.

Верная Апалонія

Адданай паплечніцай Зыгмунта Серакоўскага стала ягоная жонка Апалонія. Яе называлі «першай прыгажуняй на Літве». Апалонія паходзіла з роду Далеўскіх, які даў паўстанню трох кіраўнікоў.

Пасля смерці мужа на сустрэчы з віленскім генерал-губернатарам Мураўёвым, які вызначаўся неверагоднай жорсткасцю ў расправах з паўстанцамі, Апалонія прасіла не асуджаць яе на выгнанне з роднага краю. Яна спасылалася на кепскае здароўе і сваю цяжарнасць. На словы жонкі Серакоўскага, што на далёкай чужыне яна не зможа знайсці для сябе і дзіцяці добрых дактароў, Мураўёў адказаў: «Тым лепей». Народжаную ўжо ў царскай высылцы дачушку Апалонія назвала ў гонар мужа Зыгмунтай. Малая пражыла ўсяго адзін год.

Апалонія Серакоўская пакінула нашчадкам успаміны пра той незабыўны час. Яны поўныя горычы і смутку, але таксама і найцікавейшых дэталяў, што дазваляюць аднавіць шматлікія падзеі паўстання і стварыць партрэты яго герояў. Нельга без хвалявання чытаць, як паўстанцы прыслалі ў Вільню да Апалоніі свайго пасыльнага з просьбаю перадаць частку кашулі Зыгмунта, у якой ён быў паранены і паланёны. Баявыя паплечнікі, што бязмежна любілі свайго камандзіра, абяцалі падзяліць тканіну на часткі і разаслаць па змагарскіх аддзелах. Тыя ядвабныя, шэрыя ў чорную кратку кавалачкі кашулі натхнялі паўстанцаў разам з баявымі сцягамі.

Аўтарка ўспамінаў перакананча даводзіць, што паўстанне ў Літве-Беларусі не было польскім. Серакоўская згадвае, напрыклад, паўстанцкі сход, дзе адзін з камандзіраў — Уладзіслаў Малахоўскі — палымяна выступіў супроць варшаўскай апекі: «Досыць нам гэтай залежнай ролі! Варшава не разумее нашых патрэбаў! Павінны самі ра́дзіць сабе пра дабро сваёй зямлі. Польскі камісар мае толькі дарадчы голас!».

Юныя змагары

У шэрагах паўстанцаў 1863-га былі і падлеткі. Ім не дазвалялася ўдзельнічаць у баях, але юныя патрыёты ўсяляк дапамагалі старэйшым таварышам: падтрымлівалі сувязь паміж аддзеламі, дастаўлялі звесткі пра перасоўванне і ўзбраенне карнікаў. Звычайна апранутыя па-сялянску хлапчукі ўдала спраўляліся з заданнямі там, дзе дарослыя выведнікі маглі лёгка трапіць на падазрэнне.

Адным з такіх юных змагароў быў дванаццацігадовы Стась Віткевіч. Хлопчык меў выдатную памяць і мастацкія здольнасці. Ён мог не толькі запомніць колькасць варожых салдат і афіцэраў, але і намаляваць іхні лагер, за што шмат разоў атрымліваў падзяку ад камандзіраў перад паўстанцкім шыхтом.

Сям'ю Віткевічаў разам са Стасем выслалі з родных мясцінаў у сібірскі Томск. Праз дваццаць гадоў Станіслаў стаў вядомым мастаком і вырашыў перанесці незабыўныя ўражанні юных гадоў на карціны. На іх сапраўды яскрава ажываюць падзеі і героі таго змагарнага часу. Цяпер у Нацыянальным музеі ў Варшаве можна ўбачыць самы знакаміты твор Віткевіча «Паранены паўстанец». Знаёмыя мастака сорак гадоў хавалі гэтую карціну, каб яна не трапіла ў рукі расейскіх уладаў. Вядома, што ёю захапляўся славуты польскі пісьменнік Генрык Сянкевіч.

Магілёўскага падлетка-паўстанца Аляксея Вайніловіча царскія суддзі адправілі ў высылку, калі той меў усяго чатырнаццаць гадоў. У Сібір ён ішоў пад канвоем у адной калоне з дарослымі высланцамі. Нягледзячы на пакуты, Аляксей вёў дзённік, дзе пакінуў апісанні і малюнкі таго пякельна цяжкога шляху. Напрыклад, у Маскве, каб запалохаць арыштантаў, ім паказалі клетку, дзе калісьці ў дзесяцікілаграмовых нажных кайданах трымалі перад пакараннем смерцю правадыра сялянскай вайны ў Расеі Емяльяна Пугачова. Цяпер дзённік юнага змагара захоўваецца ў Гарадзенскім гістарычна-археалагічным музеі.

Мілавіды

На абшары былога Вялікага Княства Літоўскага каліноўцы правялі з царскай арміяй 237 баёў і баявых сутычак. Найбольшая паспяховая бітва адбылася 3 чэрвеня пад вёскай Мілавіды Слонімскага павета (цяпер Баранавіцкі раён). Там злучыліся пяць паўстанцкіх аддзелаў: слонімскі, ваўкавыскі, гарадзенскі, навагрудскі і пружанскі. Імі камандавалі Францішак Юндзіл, Густаў Стравінскі, Аляксандр Лянкевіч, Вітаўт Міладоўскі і Фелікс Улодак. Узначаліў агульныя сілы з 800 ваяроў былы падпалкоўнік царскай арміі вайсковы начальнік Гарадзенскага павета Аляксандр Лянкевіч, які атрымаў за гераізм у баях з карнікамі званне палкоўніка. У ягоным аддзеле разам са шляхтай ваявала больш за сотню пераважна праваслаўных сялянаў.

Паўстанцы сталі ўмацаваным вайсковым лагерам каля шашы Берасце–Бабруйск. Напярэдадні бітвы паплечнікаў па зброі наведаў і выступіў перад імі Кастусь Каліноўскі. Бой з нашымі ваярамі распачалі прыкладна столькі ж карнікаў, але яны былі непараўнальна лепей узброеныя і мелі чатыры гарматы. Бітва з пераменным поспехам доўжылася дзевяць гадзін. Варожыя атакі з розных бакоў гераічна адбівалі і шляхта, і сяляне-касінеры на чале з Янам Ельскім і ксяндзом Феліцыянам Лашкевічам. Захаваліся звесткі, што ў бітве ўдзельнічалі мастак Міхал Андрыёлі і будучы паэт Францішак Багушэвіч.

На змярканні расейцы не наважыліся працягваць бой і адышлі, страціўшы 50 салдат і афіцэраў забітымі ды параненымі. Тым часам да непрыяцеля падышло яшчэ чатыры сотні вайскоўцаў. Аднак калі раніцой ворагі аднавілі атакі, яны ў разгубленасці ўбачылі ўперадзе пакінуты лагер. Уначы паўстанцы зладжана адышлі, але, паколькі поле бою засталося за імі, яны і сталі пераможцамі.

Сёння пра тую перамогу нагадваюць пад Мілавідамі капліца-помнік і два мемарыяльныя камяні з партрэтам Каліноўскага ды іменамі паўстанцкіх камандзіраў. Каля іх заўсёды кветкі.

Няроўныя сілы

Супроць паўстанцаў дзейнічала амаль 150-тысячная вымуштраваная армія карнікаў: войскі, загартаваныя ў захопніцкіх царскіх войнах, а таксама паліцыя, батальёны ўнутранай варты ды іншыя, сцягнутыя для змагання з «мяцежнікамі», сілы. Яны былі выдатна ўзброеныя, мелі 120 палявых гармат. Стрэльбы расейскіх пяхотнікаў — штуцэры — у некалькі разоў перавышалі трапнасцю агню паляўнічыя стрэльбы паўстанцаў, якім увогуле не хапала агняпальнай зброі.

Каліноўцаў было ў дзесяць разоў меней, чым карнікаў, але яны ведалі мясціны, дзе ваявалі, і ўмела манеўравалі ў самых складаных умовах. Асноўным відам баявых дзеянняў паўстанцы абралі партызанскую вайну. Гэта дазваляла наносіць ворагу нечаканыя і вельмі адчувальныя ўдары. Аднак суадносіны сілаў былі занадта няроўныя.

Расейскія ўлады здолелі падмануць значную частку сялянаў, якія паверылі, быццам «паны б'юцца за вяртанне прыгону». Распаўсюджвалася хлусня, нібыта паўстанцы падпальваюць паселішчы і забіваюць вяскоўцаў. У Магілёўскай губерні, напрыклад, гуляла запушчаная царскім чынавенствам чутка, што каліноўцы спалілі вёску Цёплае і выразалі ўсіх яе жыхароў. Гэтая чутка не мела пад сабой аніякіх падставаў, але актыўна пашыралася праваслаўнымі папамі.

Магутнага сялянскага выступу баяліся і кіраўнікі паўстанцаў з лагеру «белых». Яны, адрозна ад Каліноўскага і «чырвоных», спадзяваліся найперш не на шырокую падтрымку простага народу, а на вайсковую дапамогу заходнееўрапейскіх дзяржаваў. Але гэтыя надзеі не спраўдзіліся.

Марнымі былі і разлікі каліноўцаў на сялянскае паўстанне ў Расеі. Бальшыня расейскіх дэмакратаў паставілася да барацьбы беларусаў-ліцьвінаў варожа і падтрымала царскую палітыку, услаўляючы яе ў газетных артыкулах і вершах.

Ужо ў траўні 1863 года карныя войскі задушылі паўстанне ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. Была разбітая і бальшыня аддзелаў змагароў на Меншчыне. Больш паспяхова яны дзейнічалі ў Віленскай губерні, але і там увосень баі спыніліся. Карнікі доўга не маглі справіцца з «бунтаўнікамі» толькі на Гарадзеншчыне, дзе ваяводскім камісарам быў Каліноўскі і ваявала шмат сялянаў. На захадзе Літвы-Беларусі збройнае змаганне трывала цэлы год — да пачатку 1864-га. Канцом паўстання можна лічыць арышт Кастуся Каліноўскага і яго пакаранне смерцю.

Мураўёў-Вешальнік

Задушэннем вызвольнай барацьбы кіраваў адданы царскі паслугач Міхаіл Мураўёў. Ён чыніў расправу яшчэ над паўстанцамі 1831 года, падпісаў смяротны прысуд аднаму з герояў таго часу Міхалу Валовічу. Мураўёў дамогся замены Статута Вялікага Княства 1588 года, які дзейнічаў на землях Літвы-Беларусі, расейскімі законамі. Сярод ягоных «заслугаў» — закрыццё Віленскага ўніверсітэта і спрыянне біскупу-здрадніку Сямашку ў вайне з уніяцкай верай.

Па ўсім краі на загад Мураўёва замест нашых старажытных храмаў будаваліся аднолькавыя праваслаўныя цэрквы-мураўёўкі. Беларусь ён хацеў ператварыць у частку Расеі. Ягоныя падначаленыя кіраваліся мураўёўскім дэвізам: «Што не дарабіў расейскі штык — даробяць расейская царква і школа». Гэтыя словы любіў паўтараць кіраўнік Віленскай навучальнай акругі Іван Карнілаў, якому падпарадкоўваліся ўсе школы нашага краю.

У маладосці Міхаіл Мураўёў належаў да расейскіх рэвалюцыянераў-дзекабрыстаў. Трапіўшы пасля паразы іхняга паўстання за краты ў Петрапаўлаўскую фартэцу, ён расказаў следчым усё, што іх цікавіла. Коштам здрады таварышам ён выйшаў з турмы і ўжо праз год заняў высокую пасаду Віцебскага віцэ-губернатара. Былы дзекабрыст узяўся з велізарнай стараннасцю выкупляць «грахі маладосці». Каб давесці вернападданасць цару, ён проста лез са скуры, але ніколі не забываў пра ўласную выгаду. Адзін з ягоных начальнікаў, князь Далгарукаў, пісаў пра Мураўёва: «Пачуццё асабістай годнасці, гонар, сумленне — для яго толькі пустыя словы. Ягоная рэлігія — улада і грошы». Расейскі рэвалюцыянер Аляксандр Герцэн называў Мураўёва «змоўшчыкам, які выйшаў з турмы з павышэннем у чыне, генералам, які не бываў у баях, казнакрадам, катам і інквізітарам, зверам, якога не ўбачыш і ў клетках звярынца».

У 1863-м Міхаіл Мураўёў быў прызначаны віленскім генерал-губернатарам. Ён атрымаў ад цара надзвычайныя паўнамоцтвы і стаў паўнаўладным гаспадаром краю. У першы ж дзень свайго прыезду ў Вільню Мураўёў падпісаў смяротны прысуд паўстанцу Адаму Пуслоўскаму. Гэты дваццацігадовы юнак трапіў у палон, паспеўшы пабыць у аддзеле змагароў усяго некалькі гадзін. Неўзабаве на загад Мураўёва ў Менску на месцы сучаснага сталічнага паштамта пакаралі смерцю маладога шляхціча-афіцэра Міхала Цюндзявіцкага. Ягонай галоўнай віною было пашырэнне газеты «Мужыцкая праўда» і чытанне сялянам паўстанцкай адозвы.

У адным з распараджэнняў Мураўёва гаварылася: «Калі паўстанцкая партыя (аддзел) пакажацца на адлегласці трох вёрстаў ад маёнтка, той будзе адабраны ў дзяржаўную казну. Вёска першы раз плаціць грашовую кару, а ў другі раз раўняецца з зямлёй». Арыштаваных паўстанцаў дапытвалі з лютай жорсткасцю. Іх маглі пазбавіць самага неабходнага. Змучаным пакутамі, часта цяжка параненым вязням, напрыклад, не дазвалялі спаць: царскія следчыя мяняліся, а патрыёты зноў і зноў чулі патрабаванне назваць паролі, імёны, адрасы сваіх паплечнікаў. Калі вінаватым прызнавалі аднаго, высылалася на чужыну ўся сям'я.

Верны памагаты Мураўёва жандарскі палкоўнік Лосеў казаў вязням: «Няўжо вы думаеце, што мы ў вачах вашага грамадства хочам зрабіць вас героямі? Не, нашае заданне ў тым, каб не толькі здабыць у вас прызнанне, але і выпусціць з нашых рук такімі чорнымі, каб вашыя маці вас не прызналі і ад вас адракліся».

Калі не дапамагала запалохванне і збройная сіла, хітры і бязлітасны Мураўёў не грэбаваў ніякімі сродкамі: дзейнічаў подкупамі і ашуканствам, падпісваў смяротныя прысуды, загадваў раўняць магілы паўстанцаў з зямлёй і заліваць іх змесцівам прыбіральняў, каб не дапусціць патрыятычных дэманстрацый. За сваю жорсткасць і крывавыя расправы генерал-губернатар атрымаў мянушку Вешальнік. Ёсць сведчанні, што гэты нелюдзь нават ганарыўся сваім



Майка-цішотка з выявай К. Каліноўскага, самвыдат (XXI стагоддзе)

У будучыні ў незалежнай Беларусі на вуліцах і плошчах гарадоў павінны з'явіцца помнікі, у якіх скульптары ўвасобяць аблічча тых, хто ў 1863–1864 гадах змагаўся і аддаў жыццё за вызваленне Айчыны

ганебным найменнем. Маючы на ўвазе павешанага ў 1826 годзе на царскі загад рэвалюцыянера-дзекабрыста Сяргея Мураўёва-Апостала, віленскі генерал-губернатар любіў паўтараць: «Я не з тых Мураўёвых, якіх вешаюць, а з тых, якія самі вешаюць».

У расправах з патрыётамі Вешальнік карыстаўся і такім жудасным спосабам. У адказ на просьбы сваякоў злітавасці над асуджаным на смерць і замяніць яму кару на больш лёгкую генерал-губернатар падпісваў загад пра памілаванне. Жонка, маці, сястра ці брат паўстанца спяшаліся з гэтым загадам у турму, але раней за іх туды выязджаў мураўёўскі пасланец з загадам паскорыць выкананне смяротнага прысуду. Вешальнік хацеў, каб потым родныя павешанага ці расстралянага ўсё жыццё пакутвалі ад таго, што спазніліся. Адзін з такіх выпадкаў апісаны Уладзімірам Караткевічам у рамане «Леаніды не вернуцца да Зямлі».

Карыкатуры на Мураўёва, якія тады змяшчалі еўрапейскія газеты і часопісы, паказвалі яго на пірамідах з чалавечых чарапоў, на фоне шыбеніц і падпаленых карнікамі беларускіх вёсак і мястэчак.

Пры канцы XIX стагоддзя ўлады Расейскай імперыі паставілі ў Вільні помнік Мураўёву. Віленчукі зруйнавалі яго ў часе Першай сусветнай вайны, як толькі расейскія войскі пакінулі горад. Абломкі помніка пайшлі на будаўніцтва грамадскай прыбіральні.

«Бокал заздравный поднимая»

На баку мураўёўскіх карнікаў была бальшыня славутых літаратараў Расеі, якія таксама марылі, каб у імперыі ўсе народы ўрэшце зрабіліся «русскими». Мікалай Някрасаў, якога лічаць паэтам-дэмакратам, прысвяціў Мураўёву-Вешальніку прывітальную оду, у якой услаўляў яго такімі словамі:

Бокал заздравный поднимая,
Еще раз выпить нам пора
Здоровье миротворца края!
Так много ж лет ему! Ура!

У 1863 годзе Леў Талстой пісаў паэту Афанасію Фету: «Выглядае, што справы кепскія, ці не давядзецца нам з вамі зноў здымаць меч з іржавага цвіка?». Знакаміты пісьменнік меў на ўвазе дапамогу не паўстанцам, а царскім карнікам. Яму належаць і іншыя красамоўныя словы: «Мне абсалютна ўсё роўна, што палякаў душаць».

Фёдар Дастаеўскі ў рамане «Браты Карамазавы» спрабаваў высмеяць «палякаў» (ён, як і Талстой, называў так і нашых суайчыннікаў-паўстанцаў), сцвярджаючы, што яны паехалі ў Сібір не як зняволеныя і высланцы, а нібыта за пэўны заробак як царскія службоўцы. Фёдар Цютчаў адгукнуўся на падзеі тых гадоў некалькімі вершамі, дзе ўслаўляў Расейскую імперыю і крывавую перамогу над змагарамі 1863 года:

Над русской Вильной
стародавней
Родные теплются кресты,
И звоном меди православной
Все огласились высоты.

Ён лічыў, што Расея павінна сабраць «под знамя русское» усіх славянаў і зрабіць іх «единомысленными».

Расправа над патрыётамі

Расейскія каланізатары патапілі паўстанне Каліноўскага ў крыві. Тысячы патрыётаў загінулі і памерлі ад ранаў. Дакладная колькасць ваяроў, якія палеглі за свабоду ў Літве-Беларусі, невядомая. З тых, каго захапілі ў палон або арыштавалі, паводле апошніх падлікаў гісторыкаў, 181 змагар быў павешаны ці расстраляны, блізу тысячы асуджаныя на катаргу. Дванаццаць з паловай тысяч паўстанцаў выслалі з родных мясцін, а таксама адправілі ў арыштанцкія роты царскага войска. Шмат для каго гэта было роўнае смяротнаму пакаранню. Часам у Сібір высылалі цэлыя вёскі, якія падтрымалі каліноўцаў. Болей за шэсць тысяч паўстанцаў атрымалі іншыя пакаранні, у тым ліку пазбавіліся шляхецкіх правоў і маёнткаў. Не злічыць тых, хто, ратуючыся ад пераследу, пакінуў Айчыну.

У нашым краі былі ўстаноўленыя жорсткія законы, накіраваныя на поўную русіфікацыю: ператварэнне жыхароў у расейцаў. Дзейнічалі шматлікія абмежаванні для беларусаў-каталікоў, палякаў і габрэяў. Шмат якія касцёлы ўлада зачыняла і перадавала расейскай праваслаўнай царкве. Існавалі адны расейскія школы. На беларускай мове былі забароненыя кнігадрук і выданне газет ці часопісаў. Не дазвалялася размаўляць па-беларуску ў царскіх установах.

За ўдзел студэнтаў у паўстанні каланіяльныя ўлады зачынілі адзіную на той час у Літве-Беларусі вышэйшую навучальню — Горацкі земляробчы інстытут. Замкі павесілі на дзвярах Віленскага музея старажытнасцяў. Самыя каштоўныя экспанаты вывезлі адтуль у Расею, і цяпер іх можна ўбачыць у маскоўскім Дзяржаўным гістарычным музеі. Вучоных з Віленскай археалагічнай камісіі абвінавацілі ў спачуванні «мяцежнікам» і імкненні аднавіць незалежнасць Вялікага Княства. На загад Мураўёва-Вешальніка камісію, якая збірала помнікі нашай старасвеччыны і спрыяла нацыянальнаму адраджэнню, разагналі. Замест яе з вернападданых навукоўцаў стварылі іншую камісію з падобнай назвай — археаграфічную. Але падабенства назваў не магло ўвесці патрыётаў у зман. Новая камісія павінна была даказаць, што «Северо-Западный край» царскай імперыі заўсёды быў «русским».

Пад расправу трапілі нават старадаўнія назвы гарадскіх вуліц і плошчаў. У Менску плошчу Высокі рынак улада перайменавала ў Саборную, вуліцу Бернардзінскую — у Манастырскую, Валоцкую — у Хрышчэнскую, Дамініканскую — у Петрапаўлаўскую, Зборавую — у Турэмную, Зыбіцкую — у Балотную, Францысканскую — у Губернатарскую, Феліцыянаўскую — у Багадзельную. Вуліцы з падазронымі для царскіх служак назвамі былі пераназваныя паўсюль. У Горадні, напрыклад, Брыгіцкая зрабілася Купецкай, Баніфратарская — Татарскай, Дамініканская — Саборнай.

Разам з тым пасля паўстання царскія ўлады вымушаныя былі пайсці на палёгкі сялянам. Частка беззямельных вяскоўцаў атрымала надзелы. У Віленскай, Гарадзенскай і Менскай губернях больш чым напалову зменшылася выкупная плата за зямлю, якая пераходзіла сялянам паводле царскай пастановы 1861 года пра скасаванне прыгону.

Жывая памяць

У нашай краіне шмат мясцінаў, дзе зберагаецца памяць пра вызвольнае паўстанне Каліноўскага і яго герояў. Нашчадкі прыходзяць і прыязджаюць пакланіцца магілам змагароў паблізу Мілавідаў, у вёсках Плябань на Маладзечаншчыне, Каралеўцы і Куранец на Вілейшчыне, у Ласасіне на Пружаншчыне, каля мястэчка Косава, у Горках. На Кальварыйскіх могілках у Менску спачывае паўстанец Ян Баляслаў Луцкевіч, бацька дзеячоў нашага нацыянальнага Адраджэння Івана і Антона Луцкевічаў. На ягонай магіле часта можна ўбачыць бел-чырвона-белыя стужкі і кветкі.

У вёсцы Краснае паблізу Маладзечна пахаваны апошні ўдзельнік паўстання Ігнат Абрамовіч, які пражыў 105 гадоў. Мемарыяльныя крыжы і камяні ў гонар каліноўцаў стаяць у Зарубіцкім лесе і ў Азёрах пад Горадняй, каля вёскі Арцішы Шчучынскага раёна, Голдава і Малога Ольжава на Лідчыне, паблізу вёсак Пацавічы і Мінявічы Мастоўскага раёна ды ў шмат якіх яшчэ кутках Беларусі. Да 150-годдзя паўстання вялізны крыж з шэрага граніту ў форме вялізнага мяча з'явіўся ў вёсцы Слабодка на Астравеччыне. На крыжы — выява «Пагоні» і пароль змагароў «Каго любіш? — Люблю Беларусь!»

У будучыні ў незалежнай Беларусі на вуліцах і плошчах гарадоў павінны з'явіцца помнікі, у якіх скульптары ўвасобяць аблічча тых, хто ў 1863–1864 гадах змагаўся і аддаў жыццё за вызваленне Айчыны. Адным з такіх манументаў у Менску можа стаць помнік Міхалу Цюндзявіцкаму — першаму патрыёту, пакаранаму тады смерцю ў нашай цяперашняй сталіцы. Пакуль жа зусім недалёка ад месца расстрэлу шляхціча Цюндзявіцкага стаіць на вуліцы Валадарскага бронзавы помнік царскаму гарадавому, усталяваны тымі, хто намагаецца працягваць на нашай зямлі чорную справу Мураўёва-Вешальніка.



Ірына ГРУМАНДЗЬ

Дзяды

*Туман. Дзяды. І вечнасць...
Ладдзя і роспач —
А нам абы малітвы...
Бо толькі ёю мы змываем грэшнасць
з тых костак, што ў зямлі зарыты...*

*Туман. Дзяды. І свечка...
Дагарае.
І душы голыя
спяшаюцца пагрэцца...
А нам абы прабачыць
памяць,
якая восеньскім дажджом ліецца...*

***

*Белае сонца верасня ў возеры —
на імгненне.*

*Жоўтае сонца верасня ў лісці —
на спатканне.*

*Восень на небе яблыкам
спелым
падае долу
бабціным летам
на развітанне...*

***

*Кожны радок
выліваецца келіхам,
які п'ем паасобку,
хтось уначы,
хтось на досвітку,
але нібыта разам —
з-за адчування
любові!*

***

*Абдымаючы промнямі лета,
Ты гарыш да канца, да канца...
Неспадзеўна любоўю сагрэта
Ад святога Хрыстова вянца.*

*Бел-чырвонаю-белаю стужкай
Дзесьці ў сэрцы трымціць на вятры
Мара вечнае папялушкі —
Беларускай дзяўчыны-вясны.*



Ганна КРОФТА

Час

*Разам з сябрамі знікаюць дні,
Дні, што жылі калісьці.
Падаюць доўга нямымі радкамі
Цені ў попел дарог.
Доўга чытаюцца словы кніг,
Кніг з пражылкамі лісця,
Што між старонак памяць хаваюць
Ці сціраюць знарок.
Хочацца ўзяць і ўслед паглядзець
Часу, што змоўк і высах,
Каб зразумець, што ён не ідзе, —
Коціцца ў пыльны змрок.
Толькі гады ў рады — і радзей —
Вернуцца ў снах абрысы
Нашых размоў, падзей і людзей,
Што перайшлі за парог.*

Памяці І. Я. Лепешава

*Словы тым, хто пайшоў,
Аблятаюць пялёсткамі
Сініх астраў, настояных у вадзе.
Успаміны пра тых,
Хто быў светлым, быў лепшым,
Быў настаўнікам, сябрам —
і мудрым, і простым, —
Матылькамі празрыстымі позняга лета
Завіталі з былога ў кастрычніцкі дзень.
Цяжка вымавіць словы,
калі больш нікому
Іх няможна пачуць.
Колькі роспачы з намі
Засталося!..
А з імі — хай будзе спакой.
Крылы смутку нікога
не вернуць дадому.
Яны падаюць сінімі астрамі
ў памяць,
Набрынялыя чыстай, халоднай вадой.*



Фота www.pixabay.com

Памяці І. В. Жука

*Словы, адпушчаныя ў вышыню,
Не знікаюць.
Яны прыходзяць да нас
Пялёсткамі сонечных красак
І ў спёку — шматколерным снегам.
Спяшаюцца словы праз час
Насустрач мінуламу дню —
Насустрач наступнаму дню,
Каб словам вярнуцца, не рэхам.
Спяшаюцца словы праз свет
Пялёсткамі ў хвалях блакіту,
Каб дзесьці на ўскрайку нябыту
Зноў з небам злучыцца адкрытым,
Якое і помніць, і сочыць,
Якое ўсіх прыме аднойчы.*



Святлана КУЛЬ

***

*Я слухаю дом —
ад падмуркаў па дах нагары,
Да самых яго патаемных,
аддаленых нетраў.
Так слухаюць лес —
несвядома і чуйна звяры,
Так слухаюць птушкі ў нябёсах
трымценне паветра.
Я слухаю дом як сусвет,
як нябёсы і гай;
Тут неба маё і надзейная ў цішы
бярлога,
Ён мой абаронца і мой
паўсядзённы Сінай,
Тут недзе пад дахам
асобны пакойчык —
для Бога.*

***

*Я нідзе і ніколі не бачыла
неба такога,
Каб для кожнае зоркі
было адпаведнае месца,
Каб Птушыная бегла
ў належным кірунку дарога
І падсмажаным дранікам
ззяў паміж зоркамі Месяц.
Я запомню нябёсы,
я буду ўглядацца да ранку
У малюнак сузор'яў,
шукаючы Зорнае Кола,
Я знайду Каралёў
і Малы апалонік над ганкам,
Зараніцу на ўсходзе,
з якой пачынаецца золак.
Я змагу прыгадаць у гадзіну,
абраную лёсам,
На апошнім шляху,
калі буду ў дарогу збірацца —
У якія пайсці мне
з тутэйшага свету нябёсы,
Каб хутчэй прыляцаць,
каб дамоў на Дзяды не спазняцца.*

***

*Пярсцёнак твой на левай, на маёй,
За мной цікуе ў белы дзень і ноччу,
Ён шмат гадоў з рукі маўкліва сочыць,
Каго ў пяшчоце абдымаю ёй.
Ён ведае пра кожны стогн і ўздых,
Запамінае твары і аблічча,
Ён думае, што неяк пералічыць
Табе маіх каханых і былых,
Раскажа, што любіла і люблю,
Калі мы зноўку будзем — вочы ў вочы.
Хай спадзяецца. Ляжа ён аднойчы
З маім мінулым разам — у зямлю.*



Ілля КУЛЬБІЦКІ

Партал

*казалі, што ў скверы каля універа,
у тым, дзе статуі медныя,
праз люк адкрываўся партал пяцімерны
ў самую апраметную*

*аднак жа, калі я ў той люк пагрукаў,
то ніякага не адчуў эфекту —
але не таму, што зламаўся люк, а
таму, што пераехала пекла
ў палац незалежнасці*

Архіпелаг

*глядзіце, вочы, глядзіце
вада камень дрэва аблокі камень вада
камень у вадзе ў дрэве вада
ў аблоках камень
адсюль і давеку, ад полюса да экватара
толькі кавалачак небакраю
неўзабаве сарамліва расчырванеецца,
намякаючы, што дзесь там ёсць гарады
а хутчэй, гэта проста тролі
ладзяць свята ды паляць вогнішчы
звычайныя тролі, вялізныя,
мохам парослыя
вось як гэтыя два, што ляжаць нерухома
пры сцежцы
не будзіце іх, мае вочы*

*слухайце, вочы, слухайце
вада замест солі набіраецца музыкі
нячутнай ды нечуванай
вугальна-чорныя гукавіды соснаў
у люстры блакіту
хвалярграма самотнага чоўна
на роўнядзі змяркання
нота ў сшытку — птушка,
якую сыграць забыліся*

*танчыце, вочы, танчыце
ноч рассякае хвалі
ноч апранае ўбор танцоркі
ніводзін страз не ўпадзе
з чорнага аксаміту
вада іх трымае, чорная, аксамітная
з ноччу вітаюцца іншыя караблі,
гэтаксама ўбраныя
гукавіды соснаў у вугальна-чорным люстры
гнуткі месяц выцягвае пальцы ног
сорак восем тактаў з усходу да захаду*

*кранайце, вочы, кранайце
воўна авечак, што скубуць першыя промні
воўна туману, што паволі набракае
святлом
воўна дарогі, прыбітая злёгку расою
усё з аднае наймягчэйшае кудзелі
іншая толькі намараздь на траве
калючая, бы цукровая вата па-за сезонам*

*забудзьцеся, вочы, забудзьцеся
на шэрыя хмары ды сцэны
на злыя навіны ды твары
толькі на гэтую ноч
толькі на гэты дзень
зрабіцеся, вочы, зрабіцеся
вачыма
казулі, што спрытна скокнула
з-пад самых ног*



Таццяна ЯЦУК

***

*Была рака
І кладка праз раку.
Твая рука
І вера — у руку.
Насустрач крок —
І сэрца не спыніць.
Ды незнарок
Душа мая крычыць.
Пяшчота рук —
І ніякой бяды.
І сэрца стук
На кладцы ля вады.
Ціш ля ракі
З адценнем нематы.
І светлякі,
І позірк твой, і ты.
Ды туманы
У соннай цішыні.
Званы, званы...
Пачуццяў рой, звані!
Застыў чарот —
І толькі мы з табой.
Святы палёт
Двух сэрцаў над ракой.*

***

*На карце лёсаў, горычч расшытай,
Шукаем паратунак у святых.
Здаецца, што зямля сышла з арбіты,
І зрок згубіла, і згубіла слых...*

*Дастукацца б да сэрцаў скамянелых,
Даплакацца б да душаў нежывых...
З-пад ручнікоў каб васількова-белых
Благаслаўлёна глянуў лік святы.*

Яльцы



Сяргей УКРАІНКА

Дастаў мяне цесць! Здаецца, так і даў бы ў вуха, каб глузды паправіліся ў дурной «Пенсіі». Як за дзевяноста пераваліла, такі ўжо крывы стаў: не так боршч дачка зварыла, не той нагой зяць на масніцу ступіў. Яшчэ нейкіх гадоў дваццаць таму за ім з касой не ўгнацца было — «дзявятку» цягаў, што той «шасік» ротарную касілку, і на харч быў да таго ўжо непераборлівы — учарашнюю бульбу печаную мог без солі фунтамі наварочваць. Ведама, выпрацаваўся, пасечнікам усё жыццё робячы. У жніво, праўда, Макаравіч шчыраваў камбайнерам, пачынаў яшчэ на «СК-4», потым круціў руля недапечанага «Коласа» і цягавітай «Нівы». Амаль у кожны сезон намалочваў больш за ўсіх у раёне. На сцяне, вунь, дагэтуль з-за дыпломаў шпалеры не прасвечваюцца. Аднойчы і я быў у яго за памочніка. Пракляў усё на свеце. Гэты баран у сваёй упартасці не саступіў бы крапівоўскаму: як унурыцца ў што — хоць ты даўбнёй выбівай. Помню, перад жнівом разабралі мы «Ніву», каб вычысціць нутро і праквэцаць салідольчыкам тое, што рухаецца ды круціцца. Дык вось, сабралі ўжо камбайн, завялі, нарэзалі круг вакол мехдвара. А потым я падабраў з травы запчасткі (паўвядра лішніх атрымалася), панёс у бокс, аж той чорт угледзеў: «Што ета ты там, Лёшка, валочаш?» Ёлкі-круцёлкі! Зноў давялося разбіраць гадскі «канструктар», навінчваць усе да адной гайкі, зацягваць усе балты на жатцы, зноўку рэгуляваць ланцугі… «Трэба, каб усё было, як трэба!» — і сам стаіць рукі ў бакі, а ты, Лёшка, пэцкайся ў салідоле, бы свіння ў гразі. Убіраем жыта за Палудзінай, палегліцу, па ўсім полі прайшліся, толькі самае-самае, што за праход не падхапілі, засталося. «Ну, кажу, гайда на людскія ўчасткі». А Макаравіч: «Не, зяцёк, вунь там, там і там яшчэ праедземся». «Куды тут ехаць, крычу, сонца садзіцца, калымнуць не паспеем!» «Не. Будзем падбіраць усе каласкі.» Каб жа цябе чарцякі падабралі. У той год мы з ім па намалоце выдалі другі вынік у раёне, хаця і рабілі на ўшчэнт дабітай «Ніве». Жаў у асноўным я. Бо гарэлку не піў зусім — чарговы «код да вінчы». Затое цесцечка даваў копаці за двох — і ўсё адно не паспяваў як след прарэдзіць груду пляшак у кабіне. Што ты хочаш, толькі наша вёска мела тады каля сотні двароў і пры кожным жаўцела паласа ячменю або жыта. Тры-чатыры-пяць участкаў. А ты, памочнік, шчыруй за стырном ад сутоння да сутоння. Эх, былі часіны…

Пра пасечніка я не схлусіў. Васіль Макаравіч ад самай вайны і да скону гаспадарак даглядаў сто шэсцьдзясят калгасных і два дзясяткі сваіх вуллёў. Пра пчол ведаў, здаецца, усё. Я дык іх дагэтуль баюся, а той хадзіў каля домікаў у жоўтай кашулі, без маскі, і не тое што міралюбныя карпацкія — нават агрэсіўныя сярэднярускія чамусьці заўсёды яго абміналі.

Я тут дзеля чаго бадзягу развёў… Вось колькі з Галяй жыву, дваццаць сем ужо, здаецца? Дык от: дваццаць сем гадоў Макаравіч ездзіць мне па вушах гісторыяй пра тое, як яны з суседам Грышкам перад вайной злавілі ў рэчцы пяцьдзясят восем яльцоў. Да чаго памятушчы, гад! Трымае ў галаве, у які заброд, каля каторых кустоў колькі штук патрапілася ў брэдзень, а колькі ў заставу. Рэчкі той ужо і няма — спраставалі пры Брэжневе — адно шнур-ярок струніцца па лузе да самага Сажа, а вось бач ты, чалавек яе праз усё жыццё пры сабе носіць. «Од жа ж і смачнючыя рыбкі тыя, аніводная другая не дакажа яльчыку: ні шчупак, ні нават балаба. Ну, можа, судак пацягаецца троху ў смакаце, і то не факт. Яны такія тлусценькія, прасмажыстыя, бярэш у руку з патэльні, а з хваста — кап, кап. Мяса белае-белае, і растае ў роце. Эх, каб яшчэ хоць разок на язык пакласці. Хоць перад смерцю…» Божа, як ён задзяўбаў гэтымі яльцамі! Было б там што сапраўды вартае, а то ж нейкая дробная касцістая недарэчнасць, а не рыба.

Сёлета ў пачатку ліпеня, калі мы з Галяй «адпачывалі» на градах у Макаравіча, ён мяне да таго дакалупаў сваімі «яльчыкамі», што я па-чорнаму псіхануў, кінуў-рынуў усё ў двары, шпурнуў у багажнік «Нівы» заплечнік, спальнік, жмут вудаў і пачмыхаў гравійкаю да Сажа. Было тое надвячоркам, сонца пачынала ўжо хавацца за вяршалінамі блізкіх хвой. Падумалася яшчэ: прыеду, паспрабую конікаў на беразе панакрываць брылём — ён у мяне шырокі, лёгкі і дзюрысты. Скакунцы яшчэ толькі завяліся ў траве, але, мяркую, нават на гэтых недарослікаў кляваць усё ж будзе лепей, чым на штучныя мушкі.

Шчыра скажу: не было ў мяне ані надзеі на тое, што ўдасца вывудзіць хаця які дзясятак шануемых Макаравічам яльцоў. Рэдкія цяпер яны ў нашых рэках. Нават у малых, тыпу Проні ды Басі, пераважаюць з верхаводаў галаўні і ўклейкі. Што ўжо казаць пра Сож, там яшчэ цяжэй будзе вышукаць чародку пужлівых прагоністых рыбак — не рачулка-пераплюйка ўсё ж. Як быў малады, у час шабашак я павудзіў крыху ляльнугаў пад Хвойнікамі і стоўбікаў — за Нароўляй. Гэта ўсё так прызываюцца яльцы, калі што. Вудзільна бамбукавае, асноўная лёска 0,16, павадок 0,12. Пра кручок і ўвогуле маўчу — праз фотапавелічальную лупу прывязваў, хоць на зрок тады не скардзіўся. Цяпер на верхаводных рыб палюю з вудай-бамбардай. Гэтак грозна абазвалі сваю сціплую вынаходку няўседлівыя італьянцы. Складанага ні грама: лёгкае графітавае вудзільна, па асноўнай лёсцы вольна слізгае падобны на вераценца празрысты паплавок. Далей — паўтараметровы павадок без грузка і штучная мушка. Усё. Але ж як цікава ёй вудзіць язёў ды галаўнёў! Закідваеш гэтак у плынь, потым падцягваеш плаўненька, падрыгваеш кончыкам вудзільна і — хоп!


Фота www.bagor.net

Хвілін дваццаць ехаў па ўзбярэжнай дарозе, пакуль не ўгледзеў мясціну, ад якой толькі сілаю адляпіў вочы. Сож тут вывеў мудрагелістую пятлю, быццам танкашыі карыкатурны дзядзька ўторкнуўся вялізным носам у лес. Узгорак. Своеасаблівая такая грыўка з невысокай рэдкаватай травой. Яе, відаць, і за Саюзам не надта каб касілі, а цяпер, калі той гавяды засталося на парадак менш, увогуле пакінулі ў спакоі. «Ніву» сагнаў з накатанай каляіны, паставіў каля старога лазовага куста амаль што ў цэнтры грывы. Добрая мясціна: і суха, і ад вады далекавата. Як, не дай бог, набрыдуць «зялёныя», то ўжо хваробы прыдзяруцца. Разгрузіўся і пабрыў, шаркаючы сланцамі па траве, каб ацаніць, куды закінула на гэты раз няўрымслівая рыбацкая доля. На расу яшчэ не бралася, але з травы нічога не выпстрыквала. Рана пакуль для конікаў, жніўня чакаць трэба. То і хай сабе, мушак за зіму навязаў столькі, што на пяць сезонаў хопіць. Асабліва такіх, якія цяпер яны ў мяне: дамаседам стаў, ні ў Карэлію, ні на Волжскія ерыкі ўжо не ганяю, пра стронгу ды харыуса нават марыць перастаў. Ногі, ліха на іх, пачалі падводзіць, так што з любімай вудай-нахлыстоўкай доўга па вадзе не магу цягацца. Вось паціху і шпурляю з беражка бяскрыўдную бамбарду, наталяю пакрысе гэтым эрзацам сваю рыбальскую прагу.

Што ж, беражок нічогі, не багністы, падыход да плыні лёгкі. Адсюль заўтра і пачнём запускаць нашу бамбарду.

Ноч прамінула амаль непрыкметна. Аднойчы ўсяго прачнуўся ад шуму — ніжэй па рацэ штосьці глуха выдыхнула: «Г-гах-х…» Успрасонь не разабраўся, ды і, па шчырасці, не было як, бо салодкі сон не выпусціў з абдоймаў. Чысцюткае паветра, цёплы спальнік — куды ўжо больш радасці распешчанаму горадам целу? Дазвання раскатурхалі толькі промні, што прабіліся скрозь рэдкія лазовыя лісты і ўпалі на вейкі. Усміхнуўся: ото ж і рыбачкі пайшлі, не блюдуць сутоння, калі самы клёў, а ўсё ніяк нахрапціся не могуць. Давярай такім адказныя «мерапрыемствы».

Нетаропка схрумстаў куплёны «бананавы» яблык, уздзеў заброднікі, пачапіў на пояс торбачку з павадка́мі, малы рыбнік, узяў у рукі раскладзеную з вечара вуду. Нічога не забыў?..

Праз колькі хвілін падышоў да вады. Ох, якая забойная прыгажосць! Рака пераліваецца, зіхаціць нізенькімі частымі хвалямі. Цюкнула ў галаву: «Orvis-ы» ў бардачку пакінуў, акуляры палярызацыйныя. Без іх праз гадзіну ўжо вочы пачнуць гнаць слязу і рыбалка ператворыцца ў пакуту. Прыхінуў вудзільна да галіны крывой вербалозіны, пашлыгаў да лагера. Не, гэтак мы хіба на Пятроўскія загавіны распачнём рыбаліць. Адчыніў дзверцы «Нівы», укінуў у нагрудную кішэню забродкікаў футарал з акулярамі. Раптам са спіны хтосьці патрабавальна зацяўкаў. Няголасна так, зусім не па-сабачаму. Выпраставаў тулава з салона, павярнуўся — і ўбачыў у дзесяці кроках ад машыны ўсім вядомае рыжае стварэнне. Ліса так міла і дагодліва глядзела ў вочы, што я разрагатаўся: «Ну, кумка, ну, прыстасаванка! Гэта ж дадумацца — рыбакоў мімаходзь акучваць». Звер смешна схіліў убок галаву: «Ава-ваў!» «Добра, добра, чакай, дастаю ўжо». Расхінуў на сядзенні пакет з харчам, распалавініў парэзанае за цесцевым яшчэ сталом сала, разламаў паўбохана хлеба, панёс лісе. Чакаць, пакуль яна з'есць «адступное» ад госця, не стаў, амаль не подбегам пакіраваў да пакінутай вуды. Жаба крыху прыціснула: ведаю, што лісіца папросіць яшчэ, адмовіць не змагу, сам жа тады да вечара буду смактаць палец.

Найперш прапаную рыбам «сухога» «камарыкаэмеджэр». Гэта мушка таму і «сухая», што трымаецца на паверхні, не патанае; «мокрых» я сёння ўвогуле не браў. Ёсць паклёўка! Позна. Не падсек. Адпускаю лёску на дваццаць метраў. Удар! Вывуджваю і вымаю з вады стаграмовага пад'язка. «Не тое», —крыўлюся нездаволена, але ў садок кідаю без жалю. Іду ўніз па плыні, груба тапчу вадзяную траву — эладэю, шушняк, вадзяны казялец. З яе чубоў зрэдку вымятаюцца дробныя плотачкі, уклейкі, а вось яльцоў пакуль не бачна.

Праз чатыры гадзіны ў маім рыбніку «гулялі» шэсць невялікіх пад'язкаў і сем такіх жа незаважыстых галаўнёў. Пераменьваў павадкі з мушкамі, кідаў прынаду ледзьве не пад процілеглы бераг… Марна, марна, марна.

Страўнік не вытрымаў няўвагі да сябе, «заспяваў» немілагучную песню. Я пачуў яе. Калі ішоў да машыны, пільна азіраў наваколле: ці не прытаілася дзе гаспадыня грывы. Надта не хацелася зноў дзяліцца сціплай ссабойкай «з таварышкай».

З асалодай сцягнуў з сябе заброднікі, зняў набрынялыя вільгаццю штаны. Змучаныя полівінілхларыдам ногі аж, здаецца, застагналі ад палёгкі, што прынесла ім павевы цёплага ветрыку. Перакусіў салам-хлебам-цыбуляй і прыдрамаў у цяньку лазовага куста. Зноў на раку пайшоў, калі сонца перакулілася на захад. Што казаць, надзея ўцелясніць блакітную мару дарагога, іціць яго, Макаравіча спрахла амаль дарэшты. Заставалася толькі кволенькае спадзяванне на адно нагледжанае неаблоўленае месца, там, дзе самая лука. Адразу за выгінам, за травой, — зацішак, і побач — строма. Яльцы любяць стаяць каля стромы ды высочваць розных казюрак, якіх праносіць плынь. Калі ўжо і тут не гуляе чародка, тады не ведаю. Буду збіраць манаткі.

Спыніўся на рацэ ў неблагім месцы, на за́піску. Да аблюбаванай лукі адсюль метраў дваццаць пяць, самае тое, каб не разагнаць пужлівых рыбак. Прывязваю мушку «вусень», пускаю на строму. Кругі на вадзе! Няўжо ён? Падцягваю лёску і ўжо здаля бачу: так, ялец. Ладненькі, порсценькі, рукой ніяк не ўхапіць. На «вусеня» патрапілі яшчэ дзве рыбкі, і на тым удача перастала мне назаляць. Праз паўгадзіны не вытрымаў і прывязаў чарговую прынаду. Што ты думаеш? Рыбы выскоквалі з засады на строму і хапалі падманку, нібы ашалелыя. Дваццаць тры праводкі — дваццаць два яльцы. Мушка «адамс-парашут» руліць!

Перад ад'ездам з імправізаванай стаянкі я паклаў на траву каля куста пяць яшчэ жывых галаўнёў. Нам з Галяй до будзе і пазасталых, каб павячэраць, а рыжая «кума» няхай паласуецца, наўрад ці часта ёй гэта ўдаецца.

Увечары пах ад смажанай рыбы стаяў на ўсе Палудзічы. На ўсе чатыры жылыя двары. Галя звыкла завіхалася каля газавай пліты: качала ў муцэ злёгку пасоленыя рыбныя тушкі, пераварочвала на патэльні падсмажаныя, далівала алею. Макаравіч сядзеў за сталом і нецярпліва барабаніў пальцамі па стальніцы. Нарэшце дачка паставіла на стол патэльню з прыгатаванай рыбай: «Ну, спрабуй свае печкуры». «Яльчыкі», — дакорліва паправіў яе бацька. Дачакаўся, пакуль троху прачахнуць, акуратна ўзяў адну рыбку, падзяліў удоўж, злізнуў з хваста кропельку алею, паклаў адну палавінку на язык, прычмокнуў, закаціў вочы ў прадчуванні прызабытага смаку і…

І ўсё. Расціснуў, размякчыў дзяснамі, пашамкаў ротам, пераціраючы, праглынуў. Паглядзеў з недаверам на патэльню з залацістай рыбай, нерашуча паціснуў плячыма. Потым з цяжкасцю ўстаў з-за стала, уздыхнуў глыбока-глыбока — і пабрыў на сваё сталае з нядаўняга часу месца. Жалезны ложак надрыўна зарыпеў спружынамі.

Альгердавічы

Шлях да подзвігу: Сямён Мсціслаўскі

Паданне сцвярджае: паляваў князь Сямён Альгердавіч Мсціслаўскі ў навакольных лясах, адбіўся ад світы, зірнуў на яркае сонейка і — аслепнуў.

Уражаны, упаў князь з каня на зямлю і амаль да закату блукаў, спрабуючы па гуку зразумець, дзе ён знаходзіцца. Калі сілы зусім пакінулі яго, насустрач князю выйшаў манах-пустэльнік, які падвізаўся ў Мсціслаўскай пустыні.

– Ідзі са мною, княжа, не бойся, — прамовіў пустэльнік. — Ніхто не кране цябе, пакуль ты пад маёй абаронай.

Старац вывеў князя да лясной гаючый крыніцы. Ледзь сачылася цалебная вадкасць з-пад карэння ляшчыны.

– Былі часы, з усяго краю ішлі сюды людзі за святой вадой і пазбаўляліся тут ад многіх хвароб, — распавядаў пустэльнік. — Але потым загадаў бацька твой, князь Альгерд, засыпаць крыніцу. За тое, што конь яго, схіліўшыся да вады, паслізнуўся на купіне і зламаў нагу. Выправі бацькаў учынак. Расчысці сваімі рукамі святую крыніцу. І вада гэтая здыме змрок з вачэй тваіх.

Сем дзён жыў князь у лясным скіце пустэльніка; невідушчы, расчышчаў шлях святой вадзе. І адрадзілася крыніца. І піў ваду гэтую князь прагнымі глыткамі. І падстаўляў вочы свае пад яе, і слёзы радасці сцікалі па яго шчоках. А калі вярнуўся да яго страчаны было зрок, першым, што ўбачылі вочы яго, аказаўся прыгожы, нібыта сатканы са святла лік Прасвятой Багародзіцы. Над галавой князя, у галінах старой ліпы, ззяла цудам яўленая ў гэтых глухіх мясцінах ікона. І пачуў Сямён Альгердавіч дзіўны голас, які зыходзіў ад абраза. Сказала Дзева Марыя, што адбудзецца вялікая бітва. І што князь Сямён будзе тым, хто вырашыць яе зыход. Гэта было прадказанне пра Грунвальд…

Князь Сямён, да хрышчэння Лугвэн, быў дзявятым з сыноў Альгерда. Нарадзіўся ён у 1355 годзе. Было Сямёну ўсяго тры гады, калі бацька яго далучыў Смаленскія землі да Вялікага Княства Літоўскага. Разам з імі атрымала «Літва» таксама і Мсціслаўль. Але вось калі горад гэты як цэнтр удзельнага княства дастаўся Сямёну, сказаць цяжка. Некаторыя гістарычныя крыніцы сведчаць, што Мсціслаўскім князем да 1392 года быў брат Лугвэна-Сямёна Карыгайла. Але мсціслаўскае паданне пра святую крыніцу сцвярджае, што цудоўнае вылечванне князя Сямёна было менавіта ў год Кулікоўскай бітвы, і значыць, ужо ў 1380 годзе Мсціслаўль належаў яму. Ва ўсялякім разе, манастыр, заснаваны князем Сямёнам на месцы, дзе побач з крыніцай з'явілася святая ікона, — Мсціслаўскі Пустынскі Успенскі манастыр — афіцыйна адлічвае сваю гісторыю ад 1380 года. Кажуць, першым настаяцелем гэтай абіцелі стаў пустэльнік, які вывеў князя да крыніцы.

Яшчэ адзін факт, які сведчыць, што Сямён Альгердавіч ужо ў той час быў Мсціслаўскім князем… У 1386 годзе пад Мсціслаўль прыйшло войска смаленскага князя Святаслава Іванавіча, які імкнуўся захапіць былы горад Смаленскага княства. Разам з ім ішлі страшныя саюзнікі — крыжаносцы. Сямён Альгердавіч, які толькі што прыехаў з каранацыі Ягайлы, пачаў бітву са Святаславам. Гэта была жорсткая сеча. Шмат людзей загінула, абараняючы Мсціслаўль. Але крыжаносцам горад не здалі.

Сямён Альгердавіч, пэўна, падаваўся сучаснікам надта дзіўным князем. Ён не ўмешваўся ў чужыя спрэчкі і міжусобіцы, не ганяўся за славай. Калі можна было абысціся без бою, з радасцю выкарыстоўваў такую сітуацыю. Але пры сустрэчы з няўмольным і бескампрамісным супраціўнікам смела ішоў на яго і перамагаў. 25 гадоў было яму, калі ў Мсціслаўскім лесе — пустыні, як казалі ў тыя часы — размаўляла з ім сама Царыца Нябесная. І з тых часін ніводная іншая жанчына не магла заняць месца ў сэрцы Альгердавіча. З трымценнем душэўным чакаў князь Сямён выканання прароцтва, пасля якога меркаваў пастрыгчыся ў манахі.

Аднак гады ішлі, і прыносілі яны князю неадольныя сумненні. Пустынскія манахі раілі жыць, не клапоцячыся пра заўтра, і вырашаць справы надзённыя. Сямён Альгердавіч паслухаўся іх.

У 1389 годзе наўгародцы запрасілі да сябе на княжанне Сямёна, і Альгердавіч на некалькі гадоў пакінуў Мсціслаўль. Правіць у наўгародцаў — значыць есці і спаць у даспехах. Даваўся паваяваць і міралюбіваму Альгердавічу. У 1390 годзе ён вадзіў наўгародскія дружыны на Пскоў. Дзякуй Богу, канфлікт скончыўся прымірэннем. У 1392 годзе шведы абрабавалі вёскі па абодвух берагах Нявы. Князь Сямён выступіў супраць іх і на справе паказаў, хто ў наўгародскай зямлі гаспадар.

14 чэрвеня 1394 года ў жыцці «закаранелага» халасцяка адбыліся змены. Саракагадовы князь нечакана для ўсіх прасіў руку дачкі Дзмітрыя Данскога, Марыі, якая ў наступным годзе нарадзіла яму сына Юрыя. Жонка Семёна Альгердавіча памерла ў 1399 годзе. Суровы ўдавец вырашыў выхоўваць сына, не думаючы больш аб шлюбе. Нялёгка гэта было. Таму што дзеля сына даводзілася Сямёну Альгердавічу берагчы сябе ў бітвах і паходах. Тым не менш, у 1402–1403 гадах князь Сямён дапамагаў Вітаўту ў яго барацьбе з разанскім князем Фёдарам Ольгавічам і смаленскім князем Юрыем Святаславічам.


Зрэшты, наўгародцам гэтыя паходы не прынеслі ніякіх асаблівых выгодаў. Яны вырашылі з Ноўгарада Сямёна ад граха па-далей папрасіць, а даць яму пад абарону Наўгародскія крэпасці Старую Русу і Ладагу, пастаянныя мішэні для варожых удараў. Прыняў рашэнне наўгародцаў Альгердавіч, не пазбавіў іх свайго мяча. І працягваў служыць верай і праўдай Вялікаму Ноўгараду. Аднак у апошнія гады ён усё часцей стаў наведваць Мсціслаўль. Горад гэты падаваўся яму больш бяспечным, каб расціць тут сына. Да гэтага часу Пустынскі манастыр, пабудаваны Сямёнам Альгердавічам, ператварыўся ўжо ў вядомую і вельмі паважаную абіцель. А ў 1407 годзе князь Сямён заснаваў недалёка ад Мсціслаўля і яшчэ адзін манастыр, Ануфрыеўскі. Пасадзейнічаў гэтаму, зноў жа, знак Божы. Дванаццацігадовы княжыч адпрасіўся ў бацькі на паляванне, але заблукаў і гэтак жа, як некалі сам князь Сямён, знік на цэлы тыдзень. Пошукі былі дарэмнымі, і пастарэлы пасівелы Альгердавіч упаў у храме на калені перад абразам Ратавальніка і маліў яго толькі аб адным: каб не дадзена было яму перажыць сына.

Бацькоўскае маленне было пачутае. Раніцай княжыч аб'явіўся, жывы і здаровы. І расказаў, як яго вывеў з лесу старац, які назваўся Ануфрыем. Думаючы, што гэта хтосьці з пустынскіх манахаў, Сямён Альгердавіч прыйшоў у Пустынку з багатымі дарамі. Але настаяцель запэўніў яго, што інака Ануфрыя ніколі не было сярод брацыі.

Цудоўнае выратаванне княжыча здарылася ў той дзень, калі Праваслаўная царква ўшаноўвае святога Ануфрыя. Не інакш, менавіта гэты святы стаў абаронцам Юрыя. Так узнікла Ануфрыеўская абіцель, якая праславілася ў далейшым сваімі перапісчыкамі кніг.

Мсціслаўская зямля насычалася святасцю. Прайшло трыццаць гадоў з таго дня, як князь Сямён пачуў прадказанне Багародзіцы. Час яго выканання набліжаўся…

У пачатку XV стагоддзя стала зразумела, што супрацьстаянне крыжаносцаў і славян непазбежна павінна скончыцца вялікай вайной. Да яе старанна рыхтаваўся пыхлівы і ганарысты магістр Тэўтонскага ордэна Ульрых фон Юнінген. Яго мэтай было стварэнне Вялікай Тэўтоніі ад вострава Ругэн у Балтыйскім моры да Фінскага заліва. Дзеля гэтага да ўладанняў Ордэна трэба было далучыць землі Каралеўства Польскага, Вялікага Княства Літоўскага, Пскоўшчыну і Наўгародчыну.



Бітва пад Грунвальдам

У пачатку студзеня 1409 года ў Берасці сустрэліся Ягайла і Вітаўт, якія збіраліся абмеркаваць, як адбіць націск крыжакоў. Было вырашана выступіць супраць Ордэна сумесна і з усімі сіламі, якія ўдасца сабраць, даць рашучы бой. Яго вынік павінен вырашыць зыход усёй вайны.

Арміі Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага сустрэліся і аб'ядналіся 30 чэрвеня 1410 года пад Чэрвенскам. Сюды ж падышлі і тры палкі пад ачолам Сямёна Альгердавіча, мсціслаўскі, аршанскі і смаленскі. Яны ўжо ведалі, што за бітва іх чакае, і радасна славілі Багародзіцу. Дабраславенне Пустынскіх інакаў на праведны бой і малітва ля іконы Пустынскай Божай Маці надавалі ім упэўненасці ў перамозе. Па закліку Сямёна Альгердавіча на бітву з крыжаносцамі прыйшоў таксама вялікі атрад з Ноўгарада Вялікага. Вера князя Сямёна была такая моцная, што ўзяў ён з сабой на бітву нават пятнаццацігадовага сына свайго…

Вітаўт і Ягайла павялі войскі на сталіцу Тэўтонскага Ордэна Марыенбург. Войскі сустрэліся на шырокім полі ля вёсак Танэнберг ды Грунвальд. Каго толькі не было ў абедзьвюх арміях! У шыхтах 51 харугвы крыжаносцаў акрамя саміх тэўтонцаў ішлі свецкія рыцары практычна з усіх дробных дзяржаў Германіі, атрады ваяроў з Англіі, Францыі, скандынаўскіх краін, нават некалькі шатландцаў. Больш таго, Ордэн падтрымаў венгерскі кароль са сваім войскам.

Сярод 50 польскіх харугваў 7 было з Заходняй Украіны. 40 харугваў пад началам Вітаўта былі сабраны з усёй Беларусі. Былі тут таксама літоўцы з Трок і Коўна, дружына з Валахіі, атрад чэхаў, татары хана Джэлал-ад-Дзіна.

Напярэдадні і ў пачатку бітвы пад Грунвальдам бушавала навальніца. Гэта не спрыяла крыжаносцам. Іх цяжкія коні маглі загразнуць у гразі. Ягайла ж і Вітаўт занялі пазіцыі ў пералесках. Таму крыжакі ўсяляк хацелі выманіць супраціўніка на адкрытую мясцовасць. Нават праслалі па даўняй традыцыі праз герольдаў два мячы — як афіцыйны выклік, заяўляючы: яны гатовыя нават адысці, каб даць больш месца супраціўнікам.

Але палякі марудзілі. Ягайла доўга маліўся, праслухаўшы цэлых дзве месы. Вітаўт пайшоў у атаку. Яго сустрэў агонь артылерыі і арбалетчыкаў. Атака захлінулася, і цяжкая ордэнская жалезная «свіння» рушыла наперад…

Прайшла гадзіна. Стала падаваць, што перамога хіліцца ў бок Ордэна. Войска Вялікага Княства пачало адступаць. Некаторыя лічаць, што гэта быў хітры манеўр Вітаўта. Але сучаснікі сцвярджалі, што вялікі князь беспаспяхова спрабаваў спыніць тых, хто бег, збіваў і крычаў на іх. І толькі тры палкі князя Сямёна Альгердавіча, мсціслаўскі, аршанскі і смаленскі, цвёрда стаялі на месцы. Яны не сыйшлі з пазіцый нават тады, калі крыжакі «змялі» польскае войска, калі разгарнулася ўжо барацьба за вялікую польскую харугву і сам Ягайла спалохана скамандаваў свайму акружэнню: «Панове, да лясу!». Амаль усе воіны Сямёна Альгердавіча палеглі, але іх мужнасць дала магчымасць Вітаўту перагрупаваць войска і зноў уступіць у бой. А чатыры рэзервовыя харугвы Вялікага Княства вырашылі, нарэшце, лёс бітвы.

Пыхлівы магістр Ульрых фон Юнінген загінуў на полі бою. Смерць напаткала ўсіх комтураў. Мяркуецца, што з 700 знатных ордэнскіх братоў жывымі засталіся толькі 15. Папа рымскі пісаў, што ўсяго пад Грунвальдам загінула 18 тысяч крыжакоў. Перамога была поўнай. Яна спыніла шматвекавую экспансію крыжаносцаў на славянскія землі.

Як жа склалася далейшае жыццё галоўнага героя Грунвальдскай бітвы, камандзіра трох непахісных харугваў, абранца Багародзіцы? Князь быў сціплым чалавекам і не ганяўся за зямной славай. Праз год пасля Грунвальда ён развітаўся з наўгародцамі, здзейсніўшы з імі апошні паход на шведскія землі, і назаўсёды ад'ехаў у Мсціслаўль. Тут ён жыў ціха і мірна, у гармоніі з Богам і самім сабой. Яшчэ раз ажаніўся. Займеў у шлюбе яшчэ аднаго сына, Яраслава. Яшчэ раз аўдавеў. Памёр Сямён Альгердавіч у 1431 годзе (на семдзесят шостым годзе жыцця) інакам Пустынскай абіцелі. За некалькі гадоў да канчыны герой Грунвальда прыняў схіму і манаскае імя Алексій.

Ірына Масляніцына
Мікола Багадзяж

Паэткі жаноцкасці

Кнігі Насты Кудасавай і Ірыны Ляшкевіч

Параўнанне дабратворна лагодзіць літаратурную крытыку, адбіраючы ў яе суб'ектывізм. Аднак творы паэтак з Рагачова Насты Кудасавай і са Століншчыны Ірыны Ляшкевіч параўноўваюцца як невядомыя велічыні.





Знаёмства з Н. К.

На выступе Насты Кудасавай атрымалася пабыць у берасцейскай творчай «Прасторы КХ» у 2016 годзе. Імя там на той час было невядомае.

Станоўча настройвала тое, што прэзентацыю вершаў сталічныя менеджары літаратуры зладзілі аўтарцы з перыферыі. Як-ніяк, свет усё больш ператвараецца ў глабальную вёску, і ў ёй, гэтай вёсцы, у самым глухім куце можа сядзець не абы які творца...

Як цяпер помню: чытанне фармальна нудзіла, і не толькі таму, што прыйшла купка берасцейцаў. Невыразнае гучанне не давала расчуць верш, і асаблівая раздражняла манера напрыканцы ўсё зводзіць да шэпту. І гэта, калі «на аўтамаце» ўжо зразумела: твор акцэнтуецца і акрэсліваецца часта і лагічна якраз канцоўкай, і менавіта яна powerpoint, «кропка сілы».

Сваё не самае ўдалае чытанне Н. Кудасава перапыняла расповедамі пра сябе. Даведаліся: мае адукацыю настаўніцы расейскай мовы і літаратуры, дваіх малых яшчэ дзяцей, якіх выхоўвае сама, праблемы з працаўладкаваннем, бо ў правінцы рабочых месцаў нестае. Вырасла ў сям'і, дзе гаварылі на рускай (расейскай) мове. Але «я спрабавала па прозвішчы знайсці свае беларускія карані».

Такая шчырасць справакавала задаць пытанне: а ці ёсць жаночая паэзія? Госця адказала насцярожана, неяк у духу «літаратура бывае толькі добрай або не».


А дарма. Я не пра тое, што прайшла ўжо на той час не адна дыскусія на тэму, ці ёсць жаночая паэзія, і большасць удзельніц раз'ятрана адпрэчвалі «ружовае гета». Я пра тое, што прайшлі ўжо добрых паўгадзіны чытання, і атрымалася расчуць незвычайнасць пэўных радкоў, якія ніяк не мог напісаць мужчына...

«Не хачу ні мора, ні літасці. \\ толькі б з гэтага болю выпаўзці. \\ нібы ўласная скура мне здрадзіла, \\ і на мясе раздзёртым градзіны \\ скачуць вусцішна, саламейна. \\ забяры мяне ў край кялейны, каб — душа, і вакол — ні душы...».

Або такое:

«млынавае паўнавольнае \\ мовінае рамяство \\ вонкі зманлівымі ролямі \\ выварочвае на стол \\ што ламаецца што мелецца \\ скроні спрэс у скразняках \\ скальдзіца мая кялейніца \\ ненамольная мука».

Або гэты вельмі жаночы верш, не прачытаны з нейкай прычыны тады на прэзентацыі:



«падушка — бо падаць \\ і тварам, і духам, \\ балючую вадкасць \\ з вачніцаў выплюхваць, \\ зрабіцца маленькай \\ і безабароннай, \\ абняць за каленкі \\ сваю абалонку \\ і слухаць, як вулей \\ капошыцца ў сэрцы, \\ пакуль не прачнуліся \\ дзеці.»


Зусім не здзівіла, што надрукаваны неўзабаве пасля берасцейскай прэзентацыі зборнік Насты Кудасавай з вельмі паэтычным назовам «Маё невымаўля» быў названы Кнігай 2016 года.

І нашы могуць

Праз год і ў нас пайшла пагалоска: ёсць паэтка, мае кнігу. «Вас я чакала, пэўна, Вас...\\ Калі апошні промень згас \\ Малінавага дня. \\ А шаты неба нада мной \\ І вечар сіняю сцяной — \\ Найблізкая радня. \\ Вам я шаптала, пэўна, вам \\ Кахання словы, а багам — \\ Малітвы ўдзячнасці. \\ Там сцежка вузкая ў траве, \\ І вэлюмам туман плыве, \\ Хвіліны шчаснасці. \\ Вы ўсё ж былі, напэўна, Вы... / Зляцелі гусі на ставы \\ З нябёс анёламі. \\ Пяшчотнасць Вашых вуснаў, рук... \\ А сведкі — той магутны дуб, \\ жаўрук над сёламі».

Першыя тры словы гэтага верша Ірына Ляшкевіч абрала назовам усёй кнігі. Друк узяло на сябе выдавецтва «Кнігазбор», прэзентацыі былі шмат дзе, найперш у Берасці, у Цэнтральнай гарадской бібліятэцы і ў Менску ў «Галерэі tut.by».

Кніга вельмі жаночая, поўная (чакання) пяшчоты, спад-



зявання шчасця, але і гаркаты, і мудрасці. Для яе, дарэчы, у Ірыны падставаў, мабыць, больш, чым у Насты: яна маці чатырох дзяцей, трое з іх, з першай сям'і, ужо дарослыя, гадуюць сваіх дзетак...

«Ты і маё каханне \\ ў палоне байфлая, вайфая. \\ у нас не было спатканняў, \\ але былі кветкі мая. \\ у нас былі думкі і словы, \\ яднанне шалёных сэрцаў, \\ у нас была родная мова \\ малітвай у адзінаверцаў. \\ сваіх не хавалі пачуццяў, \\ і Бог нам — не людзі! — у суддзі...»

А яшчэ больш жаноцкай паэткі тут: «Засцілаючы дол сухалісцем, \\ Не мінула ніводнай сцежкі, \\ Пэўна, восень адшуквала выйсце \\ На кароткім жыццёвым прамежку \\ З верасовай духмянай паляны, дзе самотаю бабіна лета...\\ Недзе яблык чакае крамяны \\ Еву-восень у садзе Сусвету. \\ Залатое шыкоўнае ўбранне \\ Пазрывалі вятры-ліхадзеі... \\ І на сцежцы сустрэла каханне, \\ А з каханнем адчула надзею...\\ На кароткім жыццёвым прамежку \\ найсалодшая Евіна сцежка...»

Ведзьма-вядуння

Матывы нейкага force majeure вычытваюцца, але больш вычуваюцца і ў «невымоўным» Насты Кудасавай. На пярэдні план для мяне, аднак, выйшла чыста жаночая лінія ведавання і чараў. У Ірыны Ляшкевіч чытаем:

«Да крыжоў крыжовы шлях \\ праз жыццё да скону. \\ над табою чорны птах, \\ над зямлёй паклоны. \\ у самоце твой Анёл, \\ у журбе — дарога. \\ памінальны людзям стол. \\ а малітвы Богу...»

Або яшчэ адзін заклён:

«за травамі, за цудадзейным зеллем \\ ад злых вачэй збягу ў купальскі луг.\\ дарогу сонца праменямі сцеле, \\ і кружыць галаву мядовы дух. \\ нам не шукаць з табою кветку шчасця. \\ пакінем іншым. Хай цвіце для іх. \\ я паспрабую сэрца тваё ўкрасці \\ купальскай варажбою хоць на міг».

У вершы «Кудаса» (мясцовае для «мяцеліца», як патлумачыла сама аўтарка) колеры відавочна больш цёмныя:

«Выдзьму твае спадзевы, \\ дзеі прыцерушу, \\ вусцішнай каралевай \\ выстуджу ўсю душу. \\ лепей адразу здайся \\ і не хавай ключы: \\ ад варажбы кудасы \\ моўкніку не ўцячы. \\ выцалую ўсе вершы — \\ заледзянее рот, \\ будзеш, жабрак бязвешні, \\ стыць халастым нутром. \\ я на кавадлах віру \\ лёс свой перакую — будзеш насіць як вырак \\ злую любоў маю!»

Але фіялет халоднай Н. Кудасавай у вершы «Плячо» саступае жаноцкай... так, руровасці!

«Плячом палячы, прытулі аж датуль, \\ пакуль не пачнецца віна, \\ прадыхай ратункам у скронь-слепату мне, \\ што я не адна, не адна. \\ хай збудзецца ўсё, што так страшна назваць, \\ што цепліца ў гронках-руках, \\ Пакуль я сплываю ў пляча твайго завадзь — \\ шчаслівы пакорны птах...»

Гукапіс як ключ

Ірына Ляшкевіч, атрымаўшы дыплом эканаміста, аддала перавагу... свайму з малых гадоў захапленню — музыцы і фальклору, пайшла ў школу выкладаць гэты прадмет і стварыла ў сваёй вёсцы Мачуль узорны дзіцячы фальклорны гурт «Згадка». Натуральна, у яе вершах прысутнічае гэтая музычнасць. Прысутная ў яе таксама і гукасэнсіца, характэрная добрай паэзіі: «Пад паклоны вербалозу \\ Лодка лёгка слізгане. \\ І празрыстыя стракозы \\ Пажадаюць шчасця мне». Зацемім тое, што стане відавочным, бо прадметным неўзабаве: верш Насты Кудасавай жывіцца з мелодыкі гукаў, у той час як музыка радкоў Ірыны Ляшкевіч сатканая з добра падагнаных, як цаглінкі ў ладнай кладцы, словаў, мае песенную прыроду: «Слухай, слухай...\\ Слухай, слухай...\\ Плача вецер за акном. \\ Ноч — сівая векавуха \\ Поіць поўню над сялом. \\ Слухай, слухай...\\ За ракою, \\ За прыснежаным мастом \\ Вые воўк з такой тугою \\ Пахавальны свой псалом. \\ Сон піліпаўскае ночы. \\ Адзіноты, смутку цень. \\ Сум дзявочы — лёс сірочы... \\ Слухай...\\ Хтосьці там прарочыць \\ Новы і шчаслівы дзень».

«Перагаласоўкі» ў вершах Насты Кудасавай больш канцэнтраваныя, у літарах нібыта прадказальныя, але сэнсам нечаканыя: «...загаіла б, ды гай далёка»; «Павучыны пявучы \\ даматканы радок — з тонкіх нітак сугуччаў \\ праца роспачных ног»; «спатканне — тканне спаянасці, \\ спагады вышняй пагляд. \\ пакуль не спаліцца спальнасцю \\ душы нямое цяля, \\ пакуль бясцела, бяздотыкна \\ выдыхаем дзён палатно, \\ нам дадзена кожным спотыкам \\ радніцца ў адно радно...» («Спатканне»).

Для Насты Кудасавай беларуская мова — гэта набор пярлінаў, для нас шкляных, для яе дыяментавых, якімі яна смела і захоплена гуляецца, адкрываючы ў вясёлкава-прызматычным святле новыя сэнсы. Жывучы (з маёй веды) збольшага ў полі расейскай мовы, яна ўмее цаніць свежасць новага, і дай ёй Бог яе, гэтую свежасць, захаваць як мага даўжэй. Дарэчна было б сказаць тут пра феномен Максіма Багдановіча, — абы аўтарка не паскрыўдзілася на маскулінічасць.

Для Ірыны Ляшкевіч беларуская мова таксама спецыфічная, але па-іншаму, як для прыватнага свету Кудасавай — так, як яна спецыфічная ў нас у спецыфічнай краіне з назовам Беларусь.

З майго назірання і на маёй памяці рознага роду бальшавікі ўжо трэці раз нішчаць беларускія школы, прычым «шчыруюць» яны, пераводзячы іх на расейшчыну, найперш у чыста беларускай этнічнай зоне. А вось рэгіянальнае Палессе, з волі нейкай логікі, застаецца з беларускімі школкамі. Для палешукоў, якія дома гавораць не на «трасянцы», як гэта мае месца на Магілёўшчыне, у Цэнтральнай Беларусі або яшчэ дзе, а «па-свуйму», беларуская мова — гэта чыста культуровы код, гуляцца з якім менш нагодаў. Адсюль больш «песенны» гукапіс у паэтыцы настаўніцы і фальклярысткі са Століншчыны.

Дадам яшчэ адну рысу, якая пацвярджае сказанае. Наста Кудасава відавочна больш кніжная, абазнаная ў сусветнай літаратуры. Гэта ні паляпшае, ні пагаршае — гэта ўплывае. «Верасень — роспачны Вертэр — \\ лісце пакуе ў канверты, \\ піша парывіста «Werde!» \\ малітва дрэваў пажарам.... \\ Пойдзем з чужой грымёркі \\ ў край, дзе не дзейсныя оркі, \\ выкрыкнем urbi et orbi \\ горлаў расхрыстаных праўду...»

Каб пацвердзіць папярэдняе «ні паляпшае, ні пагаршае», прывяду ў прыклад чатырохрадковік Ірыны Ляшкевіч: «Адны ўзлятаюць да нябёс. \\ Куды ж падзецца: Бог даў крылы! \\ Другім жа — павучыны лёс: \\ плясці інтрыгі да магілы».

Яўген Бяласін

Фота з архіву Н. Кудасавай і І. Ляшкевіч



Прэмія імя Ісаака Бабеля

У Залатой зале Адэскага літаратурнага музея ўрачыста ўзнагародзілі лаўрэатаў міжнароднай літаратурнай прэміі імя Ісаака Бабеля трэцяга сезона.

Сёлета свае апавяданні на конкурс даслалі 237 намінантаў з 19 краінаў свету. Акрамя Украіны і Расіі ў конкурсе прынялі ўдзел аўтары з Аўстраліі, Арменіі, Беларусі, Германіі, Грузіі, Ізраіля, Казахстана, Канады, Кыргызстана, Латвіі, Нідэрландаў, ЗША, Турцыі, Узбекістана, Францыі, Чэхіі, Эстоніі.

Першую прэмію атрымаў Рэзо Габрыадзэ з Грузіі. Другую прэмію ўручылі Аляксею Курылка (Украіна), трэцюю — Міхаілу Бару (Расія).

«У кароткі спіс прэтэндэнтаў журы ўключыла 22 аўтары. Узровень быў настолькі высокі, што яшчэ пецярых празаікаў узнагародзілі дыпломамі конкурсу», — падзяліўся журы віцэ-прэзідэнт Сусветнага клуба адэсітаў Яўгеній Галубоўскі.

Галоўны прыз конкурсу — мініяцюрная статуэтка «Кола лёсу» (скульптары Георгій Франгулян і Міхаіл Рэва). А ў гэтым годзе М. Рэва стварыў яшчэ і памятны знак «Кола лёсу», які быў уручаны пісьменніку-сатырыку Міхаілу Жванецкаму з фармулёўкай «За ўсё!».

«Вельмі шмат людзей, якія вучаць нас жыць, але мала тых, хто вучыць стасавацца з жыццём, глядзець на яго не замыленымі, а ўдзячнымі, хоць і сумнымі, вачыма. Мы ўсе з'яўляемся вучнямі аднаго такога чалавека — Ісаака Бабеля. І калі мы ў яго дрэнна вучыліся, то гэта не яго віна, а наша», — рэзюмаваў старшыня журы Андрэй Дзмітрыеў.

Беларусь — ганаровы госць Маскоўскай міжнароднай кніжнай выставы

Як паведаміла Міністэрства інфармацыі РБ, сёлета на 32-й Маскоўскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы, якая з'яўляецца буйной падзеяй не толькі для айчынных, але і замежных кнігалюбаў, наша краіна стане ганаровым госцем кніжнага форуму.



Па традыцыі кніжную выставу праводзяць у пачатку восені — з 4 па 8 верасня ў 75 павільёне ВДНГ. У рамках форуму на стэндзе «Кнігі Рэспублікі Беларусь» будуць прадстаўлены не толькі беларускія выданні. Запланавана правядзенне прэзентацый выдавецкіх праектаў, прысвечаных ключавым датам у гісторыі краіны: Году малой радзімы, 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і сумесных праектаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі. Таксама беларуская дэлегацыя будзе прымаць удзел у цырымоніі ўзнагароджання лаўрэатаў Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі», які лічыцца галоўным аглядам кнігавыдаўцоў і паліграфіі краін СНД.

У мінулым годзе беларускае выданне — 101 пераклад верша Янкі Купалы «А хто там ідзе: на мовах свету» — атрымала вышэйшую ўзнагароду.

Камплект выданняў з Беларусі перададуць Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі».

Папяровай кнізе — быць!

Даследчыца з Універсітэта Ставангера ў Нарвегіі прафесарка Аннэ Манген заявіла ў інтэрв'ю «РІА Новости», што электронныя кнігі не змогуць цалкам замяніць папяровыя.

З пункту гледжання навукі чытанне — складаны працэс, у якім задзейнічаны органы зроку, якія ўспрымаюць візуальную інфармацыю і якія перадаюць яе мозгу, дзе адбываецца «расшыфроўка» знакаў. Аднак спадарыня Манген звяртае ўвагу, што гэта яшчэ і цялесны вопыт: успрыманне прачытанага можа адрознівацца ад таго, што чалавек трымае ў руках — кнігу ці тэлефон, а таксама становішча: стоячы, седзячы ці ідучы.

«Фіксаванасць паперы як носьбіта тэкста, той факт, што тэкст не знікне, даюць чытачу «якары» для арыентацыі ў тэксце і ўспрымання прачытанага. Працэсы, якія адбываюцца ў часе чытання папяровай кнігі — трыманне кнігі ў руках, успрыманне знакаў, перагортванне старонак, нерухомасць тэксту, — усё гэта служыць «падпоркамі», якія палягчаюць кагнітыўныя намаганні пры ўспрыманні матэрыяла. І гэтыя «падпоркі» могуць быць асабліва важныя пры чытанні складаных для разумення тэкстаў», — адзначыла А. Манген.

«Пракручванне» тэкста на экране смартфона, наадварот, павялічвае кагнітыўную нагрузку.

Паводле даследаванняў, розніца ва ўспрыманні тэкстаў істотная, калі гаворка ідзе пра вялікія і складаныя матэрыялы, калі чытачу трэба доўга ўтрымліваць увагу на адным прадмеце і сачыць за храналогіяй падзей. Успрыманне кароткіх тэкстаў ды інструкцый, якія займаюць адну старонку або адзін экран, не залежыць ад носьбіта.

А. Манген выказала здагадку, што ўспрыманне тэкстаў будзе шмат у чым залежаць ад літаратурнага жанру.

Гаворачы аб далейшым лёсе папяровых кніг, А. Манген падкрэслівае, што важна адрозніваць сферы іх прымянення, а таксама звяртае ўвагу на розніцу паміж сітуацыяй у ЗША, Еўропе ды іншых краінах.

«У цяперашні час у сферы вышэйшай адукацыі, напрыклад, у ЗША, адзначаецца зрух у бок электронных кніг, аднак гэта шмат у чым тлумачыцца высокім коштам папяровых падручнікаў», — сказала экспертка.

Пры гэтым у шэрагу выпадкаў для навучання папяровыя кнігі могуць саступаць больш наглядным мультымедыйным матэрыялам. На думку А. Манген, задача даследчыкаў і чыноўнікаў у сферы адукацыі — знайсці правільны баланс паміж матэрыяламі, якія павінны быць прадстаўлены ў лічбавым фармаце і ў традыцыйным папяровым.

Пры гэтым яна спакойная за лёс папяровых кніг. «Статыстыка паказвае, што продажы электронных кніг тыпу Kindl, створаных спецыяльна для чытання доўгіх тэкстаў, у цяперашні час практычна не растуць», — заўважыла яна.

А. Манген развенчвае міф пра тое, што прадстаўнікі «лічбавага пакалення», маладыя людзі, якія нарадзіліся пасля распаўсюджвання інтэрнэту і лічбавых тэхналогій, аддаюць перавагу электронным кнігам. «Нельга сцвярджаць, што маладое пакаленне зможа больш чытаць з экрана, калі яны будуць станавіцца старэй. На самай справе даследаванні паказваюць адваротнае, — адзначыла яна. — Так што нам не варта турбавацца, што папяровыя кнігі знікнуць».

Мільён даляраў за першае выданне «Яўгенія Анегіна»...

Паводле паведамлення BBC News, першае выданне вядомага рамана ў вершах Аляксандра Пушкіна «Яўгеній Анегін» прадалі на таргах аўкцыённага дома «Christie's» у брытанскай сталіцы за 467,2 тысячаў фунтаў стэрлінгаў.

Гэты кошт стаў утрая большым за ацэначны, паколькі лот складаў каля 120–160 тысячаў фунтаў стэрлінгаў.

У аўкцыённым доме заявілі: «Гэтае выданне «Яўгенія Анегіна» — сапраўдная бібліяграфічная рэдкасць. У камплект уваходзіць выданне першай часткі рамана ў арыгінальным пераплёце». Першае выданне рамана Аляксандра Пушкіна «Яўгеній Анегін» 1825–1827 гадоў пабачыла свет у друкарні дэпартамента народнай асветы Санкт-Пецярбурга.

На сайце аўкцыённага дома адзначаецца, што на таргі «Залаты век рускай літаратуры» было выстаўлена 121 рэдкае друкаванае выданне з прыватных еўрапейскіх калекцый, сярод іх творы Пушкіна, Лермантава, Гогаля, Фета, Дастаеўскага ды іншых рускіх класікаў.

Быў прададзены лот 35: «Лірычны пантэон» Апанаса Фета — рэдкае першае выданне першай кнігі вершаў паэта, выдадзенае аўтарам пад крыптонімам «А.Ф.», калі



аўтар быў студэнтам Маскоўскага ўніверсітэта і членам гуртка Апалона Грыбаедава. Паэтычны зборнік купілі за 100 тысячаў фунтаў, пяцікратна перавысіўшы пачатковую ацэначную суму.

За 175 тысячаў фунтаў стэрлінгаў быў прададзены лот 36: двухтомнік Мікалая Гогаля «Вечары на хутары ля Дзіканькі» — вельмі рэдкае выданне першага шэдэўра М. Гогаля.

Помнікі мушкецёрам

Помнікі ставяць не толькі вялікім пісьменнікам, але і іх папулярным літаратурным героям.

88 гадоў таму — 12 ліпеня 1931 года — у Ошы, адміністрацыйным цэнтры акругі Ош і дэпартамента Жэр ды галоўным горадзе гістарычнай правінцыі Гасконь у Францыі быў усталяваны помнік у гонар, мабыць, самага вядомага гасконца ў свеце — мушкецёра д'Артаньяна. Манумент усталявалі герою знакамітага цыкла прыгодніцкіх раманаў вядомага французскага пісьменніка і кулінара Аляксандра Дзюма.

Раман «Тры мушкецёры», а таксама «Граф Монтэ-Крыста» чыталі амаль усе і, як правіла, у юным узросце. А калі хто і не чытаў, то дакладна глядзеў экранізацыю рамана пра легендарную чацвёрку мушкецёраў.

З нядаўняга ж часу ў французскай Гасконі стаіць помнік, да якога прыклаў руку... Адгадайце, хто? Вядомы маскоўскі скульптар Зураб Цэрэтэлі.

Менавіта ён стварыў і падарыў помнік «Чатыры мушкецёры» мсье Мантэск'ё — нашчадку роду д'Артаньяна. Аднак Мантэск'ё вырашыў падарыць гэты помнік гасконскаму гораду Кандом, які быццам бы лічыцца мушкецёрскай сталіцай Гасконі. Манумент устаноўлены на галоўнай плошчы горада.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by